© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

СПАДАРОЖНІКАВАЕ!

- **БТ, РТР, Астанкіна, НТБ**
- **С.-Пецярбург, Польшча-1, Польшча-2.**

В.НОВІКАЎ:

УСЕ МЫ АБАВЯЗКОВА БУДЗЕМ СЯДЗЕЦЬ..,–

так сьцвярджае лідар беларускіх камуністаў

ст. 2

ДЗІКАЯ ПОМСТА?

Ужо тыдзень гарадзенская міліцыя ня можа ўстанавіць асобы невядомай дзяўчыны, труп якой з прыкметамі гвалтоўнай сьмерці знайшлі ў лесе каля аўтапарку. У похву ахвяры забойцы загналі бутэльку.

Па заключэньню эксьпертаў, дзяўчына хварэла цяжкай венерычнай хваробай. Забойства магло быць помстай за тое, што ахвяра падзялілася ёю з кімсьці са сваіх кавалераў.

Іншыя крымінальныя навіны на *ст. 8.*



23-24 жніўня пераменная хмарнасьць, пераважна без ападкаў. Кароткачасовы дождж магчымы толькі днём у нядзелю, вецер паўднёвы, слабы. Тэмпература паветра ноччу 11-16, днём 23-28 градусаў цяпла.

ПАГОНЯ

ЗАСНАВАНА Ў 1920 г

ВЫХОДЗІЦЬ ПА ПЯТНІЦАХ

ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

№ 34 (181) • 23 – 29 жніўня 1996 г. • Кошт свабодны

МІННАЕ ПОЛЕ, АЛЬБО ПАСТАЯННЫ БОЛЬ

...пераважная большасьць народу зьбяднела...

...прычына нашых сёньняшніх цяжкасьцей заключаецца, на мой погляд, у той непрадуманай палітыцы...

...у Эўропе нас ніхто не чакае з нашай прадукцыяй...

...вось і атрымаецца, што мы замест Канстытуцыі будзем мець "Трышкін кафтан"...

...прэзідэнт часта ня можа выконваць адзін закон, не парушаючы другога...

...я не пайду ні на якія партыйныя пасідзелкі...

...простыя людзі засталіся адны са сваёй бядой...

(З выступу прэзідэнта РБ А.Лукашэнкі на сустрэчы з прадстаўнікамі грамадзкасьці Гарадзенскай вобласьці.)
(Здымкі зроблены з тэлеэкрана - фотакарэспандэнта "ПАГОНІ" на сустрэчу з прэзідэнтам не пусьцілі).

ПРЭЗІДЭНТ ПРА СВАЮ МАЦІ

Сарак чатыры мільярды рублёў пералічана Гарадзеншчыне для кампенсацыі насельніцтву абясцэненых грашовых рахункаў у банках. Гэтыя сродкі выдаюцца інвалідам і ветэранам вайны.

Пад час нядаўняй сустрэчы з калгасьнікамі ў Бераставіцкім раёне, А. Лукашэнка параіў атрыманыя грошы "несьці ў банк, які цяпер стаў прэзідэнцкім, г.зн. надзейным". Сваю параду ён падмацаваў адмоўным прыкладам сваёй маці. "У мяне, ведаеце, таксама "варона" сядзіць. 72 гады. Атрымлівае разам з пеньсіяй і грашыма за малако 800 тысячаў. Але замест таго, каб пакласьці іх на "кніжку" — хавае ў панчоху..."

На пытаньне калгасьнікаў, чаму ім не выплочваецца кампенсацыя, прэзідэнт адказаў: "Пачакайце — у вас бульба ёсьць!"

В.ДРЭМА.

САБАКА ВЫКРЫЎ НЕЛЕГАЛАЎ

На мінулым тыдні нарсудом Гарадзенскага раёну была разгледжана крымінальная справа па абвінавачваньню двух грамадзян Грэцыі ў арганізацыі незаконнага пераходу дзяржаўнай мяжы . Яны спрабавалі вывезьці 16 грамадзян Шры-Ланкі праз беларуска-польскую мяжу ў сьпецыяльных сховішчах, зробленых пад падлогай аўтобуса. Беларускую мяжу яны праехалі, але пільнасьць праявіў польскі памежны сабака.

Абодва падсудных пакараны на 1,5 года пазбаўленьня волі з канфіскацыяй аўтобуса. Пададзеная імі скарга на суровасьць прыгавору будзе разгледжана абласным судом 3 верасьня.

С.С.

"ХАЙЛЬ!" – ЛОЗУНГ ВЕРТЫКАЛІ

Учора ў аблвыканкаме адбылася нарада кіраўнікоў выканаўчай улады вобласьці. Абмяркоўваліся пытаньні арганізацыі і правядзеньня на Гарадзеншчыне прэзідэнцкага рэферэндуму. Прадстаўнікам абласной "вертыкалі", якія не падтрымоўваюць ідэю рэферэндума, старшыня аблвыканкаму А.Дубко прапанаваў падаць у адстаўку.

В.М.

ПАГОНЯ ВА ЎСІХ АДДЗЯЛЕНЬНЯХ СУВЯЗІ!

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА

НА IV квартал 1996 г.

Падпісная цана "ПАГОНІ"
на 1 месяц – 8 тыс. руб.
на квартал – 24 тыс. руб.

Падпісны індэкс 63124.

ПАДАРУНКІ АД "УДЗЯЧНЫХ" ГАРАДЗЕНЦАЎ

...Аляксандра Лукашэнку ў Горадні чакалі. Але далёка не "тысячи на всех перекрёстках" і ня толькі для таго, каб выказаць захапленьне сваім жыцьцём "пад прэзідэнтам".

Асабліва старанна рыхтаваліся да сустрэчы прэзідэнта міліцыя і КДБ. Яны сачылі ня толькі за парадкам вакол тэатра, у якім зьбіраўся выступаць А.Лукашэнка, але і за тым, каб ніхто не сапсаваў "бацьку" нервы. З-за гэтага два падлеткі з СШ N 27, якія прынесьлі (па іх словах, пад прымусам кіраўніцтва школы) напісаны на шпалерах плакат "Спасибо за заботу об одарённых детях", мусілі яго двойчы дэманстраваць "людзям у форме". І толькі пасьля гэтага былі дапушчаныя на "сьветлыя вочы". Але ўберагчы прэзідэнцкі паказушна-дабрадушны настрой ўсё ж не ўдалося.

Як толькі Аляксандр Лукашэнка ўзьняўся на пляцоўку перад тэатрам, з правага боку ад яго панеслася гучнае "У адстаўку!" і ўзьніклі бел-чырвона-белыя сьцягі і плакаты: "Чакаем чарговую порцыю абяцанак-цацанак" і "Наша Радзіма - Беларусь, твая - Расея". Замест таго, каб смакаваць паднесены каравай і прымаць кветкі, раз'юшаны прэзідэнт кінуўся ў бок людзей, якія выказалі яму такі "цёплы" прыём. Ахова пачала рваць плакаты і сьцягі, а сам прэзідэнт паабяцаў, што будзе правіць яшчэ два тэрміны.

Пакуль у зале тэатра найбольш разумная і падрыхтаваная, па словах Лукашэнкі, частка грамадзкасьці вобласьці, успомніўшы брэжнеўскія часы, ляскала ў далоні ледзь не пасьля кожнага сказу, "удзячныя" гарадзенцы "выкінулі" яшчэ адзін нумар.

Некалькі маладых хлопцаў, мабыць, абураных хлусьнёй, якая неслася з дынамікаў, кінулі пад ногі і пачалі таптаць чырвона-зялёны сьцяг. Аднаго з юнакоў міліцыянты за гэта адразу пацягнулі ў машыну.

Пасьля гэтага выпадку ахоўнікі парадку мелі клопаты толькі з аматарамі піва, прыбалдзеўшымі ад яго вялікай колькасьці ў нібыта з-пад зямлі ўзьнікшых гандлёвых радах. Амаль уся іншая публіка разыйшлася задоўга да канца трансьляванай на ўсю краіну сустрэчы.

Віктар ЛЮДВІКОВІЧ.

ПАЛЯВАНЬНЕ НА АЛІМЕНТШЧЫКА

Развал Савецкага Саюзу даў магчымасьць злачынцам хавацца ад правасуддзя ў сваіх "нацыянальных кватэрах". Такая агульная думка нашага грамадзтва. Нядаўна супрацоўнікі міліцыі, суду і пракуратуры Гарадзеншчыны даказалі, што ў беларускага закона доўгія рукі.

Грамадзянін Л.Лунёў быў асуджаны за ўхіленьне ад уплаты аліментаў у ліпені 1994 году на адзін год папраўчых работ. Літаральна на наступны дзень Лунёў пагрузіў асабістыя рэчы ў кантэйнер і адправіў на Украіну, а затым зьехаў сам. Згодна з Канвенцыяй "Аб прававой дапамозе і прававых дачыненьнях па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах", падпісанай у Менску 22 студзеня 1993 году, да якой у 1995 годзе далучылася і Украіна, дзяржавы СНД выдаюць асуджаных злачынцаў у выпадках, калі яны пакараны пазбаўленьнем волі звыш 6 месяцаў. Такім чынам, Лунёў не падлягаў выдачы, паколькі быў пакараны не пазбаўленьнем волі, а папраўчымі работамі.

Аднак нашыя праваахоўцы таксама разумеюць у законах. 15 верасьня 1995 году суд Зэльвенскага раёну па прадстаўленьні міліцыі замяніў Лунёву папраўчыя работы на пазбаўленьне волі за злоснае ўхіленьне ад выкананьня прыгавору. Пасьля чаго пракуратура Беларусі зьвярнулася ў Генеральную Пракуратуру Украіны з просьбай аб выдачы Лунёва.

Ягонае месцазнаходжаньне сышчыкі вылічылі па грузавых дакументах на адпраўлены год назад кантэйнер. Украінскія калегі прывезьлі аліментшчыка ў пасёлак Дабранка Чарнігаўскай вобласьці, што на мяжы з Беларусьсю, і перадалі супрацоўнікам Зэльвенскай міліцыі.

Сяргей САМАСЕЙ.

"АЗОТ" НЕ ЗГАРЭЎ

Гарыць "Азот"! 19 жніўня гэтыя словы, разам з дымам, які стаяў слупом, разьнесьліся па ўсёй Горадні.

Як паведамілі нам супрацоўнікі пажарнай аховы УУС аблвыканкаму, паведамленьне пра пажар на "Азоце" паступіла ў 13 гадзін 22 хвіліны. На тэрыторыі цэха "Аміяк-3" гарэла градзільня. Ужо праз дзьве хвіліны пажарнікі пачалі тушыць полымя. У 13.33 пажар быў ліквідаваны.

Прычынай яго, як высьветлілася, быў агонь ад зваркі, які трапіў на імпартнае пластыкавае пакрыцьцё. Асноўная частка даху згарэла. Паколькі і цэх, і градзільня былі на рамоньце, іншых вялікіх стратаў пажар не прынёс.

Вітаўт РУДНІК.

УВАГА !

З 22 жніўня ў рэдакцыі "ПАГОНІ" зьмяніліся нумары тэлефонаў.

72-29-96, 72-35-61

ПАДМАН ПРАЦЯГВАЕЦЦА

16 жніўня супрацоўнікамі Кастрычніцкага РАУС Горадні быў праведзены чарговы рэйд па выяўленьню парушэньняў правілаў гандлю на Скідальскім рынку. У рэйдзе ізноў прынялі ўдзел актывісты з таварыства спажыўцоў, якія ўваходзяць у яго склад ад партыі БНФ, і карэспандэнт "ПАГОНІ".

Праверка выявіла парушэньні, пра якія наша газета ўжо неаднаразова пісала: выкарыстаньне бытавых вагаў, пры дапамозе якіх вельмі лёгка абвешваць пакупнікоў. Як ашуквалі на кілаграме на 200-300 грамаў, так і ашукваюць. Супрацоўнікі міліцыі канфіскавалі некалькі вагаў, але па ўсім відаць, што ў гаспадароў яны не апошнія.

Адміністрацыя рынку па-ранейшаму спасылаецца на адсутнасьць паўнамоцтваў штрафаваць парушальнікаў і канфіскоўваць іх тавар. Начальнік аддзела гандлю гарвыканкаму Уладзімір Стома, наадварот, сьцьвярджае, што ў рамках Закона паўнамоцтваў адміністрацыі рынку хапае, трэба толькі пастаянна гэтым займацца.

Магчыма, што ісьціна дзесьці пасярэдзіне. Кантралёраў, у тым ліку ўзброеных, у нашай краіне дастаткова. Усе яны маюць права штрафаваць, канфіскоўваць і, нават, арыштоўваць. Аднак, парадку штосьці не прыбаўляецца. Выснова адна - калі ўлады ня ў стане навесьці парадак на звычайным базары, то што казаць пра рынкавую эканоміку ўцэлым?

Міхась КАПЯЛЮШ.

А ПРА ЛЮДЗЕЙ ЗАБЫЛІСЯ

У двары дома N 12 па вуліцы Кабяка ў Горадні МП "Арнікс" будуе платную аўтастаянку. Абураныя жыхары дома, для якіх гэта ўжо чацьвёртая стаянка паблізу іх дома, накіравалі ліст да кіраўніцтва вобласьці і горада. Копію ліста з 42 подпісамі атрымала і рэдакцыя "ПАГОНІ".

"Мы ўжо не скардзімся на тое, што ў нашым раёне няма крамаў, дзіцячых садкоў, тэлефонаў, што далёка аўтобусны прыпынак, -гаворыцца ў лісьце. - Але дзеці нашыя цяпер вымушаныя гуляць не ў бясьпечным двары, як раней, а паблізу дарогі. Хто дасьць гарантыю, што трохпяцігадовае дзіця не пабяжыць за мячом і не апынецца пад машынай?"

У доме, акрамя маладых сем'яў, жывуць таксама перасяленцы з Чарнобыльскай зоны (тры пад'езды), шмат афганцаў, інвалідаў вайны і працы. Усе яны ў свой час паклалі шмат сілаў, каб добраўпарадкаваць двор ("езьдзілі ў пітомнік і лес за саджанцамі, рабілі гароды..."), а ў выніку іх, як ваўкоў, з усіх бакоў абклалі аўтастаянкамі. "Гораду выгадна - атрымаў грошы. А вось пра людзей забыліся", - пішуць абураныя жыхары дома.

Друкуючы гэты ліст, "ПАГОНЯ" спадзяецца, што гарадзенскія ўлады не пакінуць яго без адказу, як гэта было са зваротамі жыхароў гэтага ж дома з нагоды будаўніцтва папярэдняй аўтастаянкі.

В.ДРЭМА.

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА

"УСЕ МЫ АБАВЯЗКОВА БУДЗЕМ СЯДЗЕЦЬ..."

З такімі словамі В.Новікаў, старшыня Беларускай партыі камуністаў, зьвярнуўся да прадстаўніка БНФ Л.Баршчэўскага, нагадаўшы, што гэту фразу ён казаў яшчэ ў 1993 г., калі ў Канстытуцыю РБ уносілася прапанова аб прэзідэнцтве, - супраць увядзеньня гэтай пасады тады выступалі і БНФ, і КПБ. Што хацеў гэтым сказаць лідар камуністаў? Што ўсе сядзем у турму, як здарылася з вядомымі лідарамі БНФ, альбо тое, што прыйдзецца разам сесьці за круглы стол для вырашэньня эканамічных ды палітычных праблемаў Беларусі?

21 жніўня ў Менску ў культурна-асьветніцкім цэнтры сабраліся кіраўнікі палітычных партыяў Беларусі: Беларускага Народнага Фронту, Аграрнай партыі, Беларускай сялянскай партыі, Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады, "Белорусского патриотического движения", Аб'яднанай грамадзянскай партыі, Партыі ўсебеларускага адзінства і згоды, Партыі беларускіх камуністаў, Партыі народнай згоды і Экалагічнай партыі. Таксама на "круглы стол" былі запрошаныя прадстаўнікі ВС, Кабінету Міністраў, Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў, Беларускага савету калгасаў, Беларускага Хельсінгскага камітэту, Канстытуцыйнага і Вышэйшага гаспадарчага судоў. Ад аргкамітэту "круглага стала" было накіравана запрашэньне і Прэзідэнту РБ А.Лукашэнку, у якім, у прыватнасьці гаварылася, што "мы маем надзею, што Вы, Аляксандр Рыгоравіч, як палітык, які палымяна жадае дабра сваёй краіне, свайму народу, гатовы на палітычнае супрацоўніцтва з усімі палітычнымі сіламі рэспублікі". Але сам Аляксандр Рыгоравіч ня з кім з іх размаўляць не захацеў і на "круглы стол" не прыйшоў.

Старшыня ВС сп.С.Шарэцкі зазначыў, што словы Прэзідэнта (пад час выступленьня ў Горадні) пра тое, што на Беларусь насоўваецца фашызм -бессэнсоўнасьць. Фашызм будзе толькі тады, калі ў нас будзе панаваць адзін погляд на падзеі і жыцьцё, і калі астатнія погляды будуць забаронены толькі таму, што яны не супадаюць з поглядам кіраўніка дзяржавы. "А тут, за гэтым сталом, - працягваў сп.Шарэцкі, - якраз і сабраліся лідары розных партыяў, каб выказацца самім і выслухаць усе асноўныя палітычныя сілы з жаданьнем прыйсьці да нейкага агульнага рашэньня па выведу Беларусі з крызісу".

Пра тое, што такога эканамічнага крызісу ня зьведала ні адна з былых краін СССР, сьцьвердзілі сп.С.Багданкевіч і сп.Ю.Хадыка, якія на прыкладзе эканамічных паказчыкаў Беларусі абгрунтавалі гэтую выснову.

Абараніць Прэзідэнта спрабаваў прадстаўнік ураду С.Лінг, які пачаў расказваць пра пад'ём у нашай эканоміцы. Праўда, гэтыя словы ў большасьці выклікалі сьмех. На выказваньне С.Лінга, што толькі дзякуючы А.Лукашэнку ў нас такая нізкая квартплата і што толькі дзякуючы Прэзідэнту ў тэрмін выплочваецца заробак, прадстаўніца Беларускай партыі жанчын "Надзея" сп.С.Бястужава адказала, што ў працэнтных адносінах да зарплаты ў нас самая высокая квартплата ў сьвеце, а пра своечасовую выплату заробку "пасаромеліся б і ўзгадваць".

З прысутных на "круглым стале" лідараў палітычных партыяў падтрымку дзейнасьці Прэзідэнта выказваў толькі А.Баранкевіч - прадстаўнік "Белорусского патриотического движения" (артадаксальныя камуністы):

Па выніках працы "круглага стала" было падпісана пагадненьне. Згодна з ім, між іншым, удзельнікі "круглага стала" узялі на сябе абавязкі забясьпечыць галоснасьць у дзейнасьці ўсіх структураў улады і дамагчыся правядзеньня давыбараў у Вярхоўны і мясцовыя Саветы.

Некаторыя з удзельнікаў "круглага стала", у прыватнасьці Д.Булахаў, выказваліся за ўвядзеньне дадатковага пункту ў пагадненьне са зваротам у ВС правесьці свой рэферэндум з пытаньнямі кшталту: "Ці згодны Вы з эканамічнай палітыкай Прэзідэнта, з узроўнем Вашай зарплаты?" Але сэнс гэтай прапановы вырашылі адлюстраваць у тэксьце заявы, якая зараз распрацоўваецца і ў хуткім часе зьявіцца ў сродках масавай інфармацыі.

Прадстаўнікі БНФ выказаліся супраць усякіх рэферэндумаў, што зьневажаюць беларускі народ, які спазнаў сапраўдную галечу. Паўстала пытаньне пра тое, адкуль Прэзідэнт бярэ такія вялікія грошы для рэферэндуму? Пра гэта казалі сп.Г.Тарасевіч і сп.С.Багданкевіч. У выступах прагучала, што прэзідэнцкія структуры ўзялі пад сваю ўладу самыя дарагія будынкі ў цэнтры Менску, заграбаюць з іх вялікія грошы і называюць усё гэта бюджэтным прэзідэнцкім фондам, у той час, калі сьціплыя грамадзянскія падаткі працуюць на ўсю дзяржаву і ўвесь бюджэт, на тыя ж сілавыя структуры. З таго ж "прэзідэнцкага фонду" А.Лукашэнка зьбіраецца фінансаваць і "Беларускі нацыянальны кангрэс", які арганізуе памочнік прэзідэнта С.Посахаў. У выступах адзначалася, што людзі месяцамі не атрымліваюць заробку, а тут знайшліся сродкі на камандыроўкі і абслугу 5 тысячам паслухмяных альбо залежных ад прэзідэнцкіх структур рабочых.

Прадстаўнікі БНФ выказалі прапанову па імпічменту Прэзідэнту, але гэтую прапанову было вырашана абмеркаваць пад час выпрацоўкі агульнай заявы.

Наступнае паседжаньне "круглага стала", які абвешчаны ўдзельнікамі пастаянна дзеючым, у бліжэйшую сераду.

Людвік ВАЛЫНЕЦ.

ХТО ДАСЬЦЬ АДКАЗ?

Ці ёсьць загад аб затрыманьні лідараў БНФ Зянона Пазьняка і Сяргея Навумчыка? Ці распачаты супраць іх крымінальны перасьлед? Ні ўрад, ні МУС, ні КДБ і Пракуратура адказу на гэтае пытаньне да гэтуль не далі. Магчыма, гэта зробіць парламанцкая камісія, аб стварэньні якой з просьбай да старшыні Вярхоўнага Савету Сямёна Шарэцкага зьвярнуўся выканкам фракцыі па захаваньню Грамады (БСДГ). Гэтая камісія, на думку аўтараў звароту, павінна даць таксама афіцыйную адзнаку Вярхоўнага Савету ўсім падзеям вясны 1996 году.

Вітаўт РУДНІК.

УКРАІНЦАЎ НА РАСЕЙЦАЎ

Запланаваны на 21 жніўня суд над грамадзянамі Украіны, затрыманымі ў Менску пад час "Чарнобыльскага шляху-96", перанесены на пазьнейшы тэрмін і ўвогуле можа не адбыцца. З неафіцыйных крыніцаў стала вядома, што ўжо амаль дасягнута дамова аб абмене сямі ўкраінцаў на ўзятых у палон у Чачні расейскіх вайскоўцаў.

Ул.інф.

БССР НЕ БЫЛА СУВЕРЭННАЙ КРАІНАЙ

Прэзідэнт лічыць, што ў складзе СССР Беларусь была сапраўднай суверэннай дзяржавай і таму адзначаць Дзень Незалежнасьці 27 ліпеня ня трэба. Замест яго Лукашэнка плануе абвясьціць 3 ліпеня Днём Рэспублікі.

Ад самога ўтварэньня БССР, яе кіраўніцтва ніколі не абараняла суверэнітэту краіны. Па Рыжскаму пагадненьню 1921 году, Беларусь была падзелена паміж Польшчай і РСФСР. Прадстаўнікоў БССР нават не было на перамовах у Рызе. Савецкія падручнікі сьцьвярджалі: "Интересы БССР защищала делегация РСФСР". Добрая ж атрымалася абарона! "Суверэнная" БССР чамусьці ня выступіла супраць таго, што ад краіны засталася толькі Менская вобласьць.

У 1932 годзе СССР падпісаў з Польшчай дамову аб ненападзе. У ёй сьцьвярджалася, што Савецкі Саюз ня мае да II Рэчы Паспалітай ніякіх тэрытарыяльных прэтэнзій. Урад БССР прамаўчаў, быццам бы забыўся пра палову беларускай нацыі, якая жыла за польскай мяжой.

23 жніўня 1939 году быў заключаны пакт паміж СССР і Нямеччынай, падпісаны сакрэтны пратакол аб падзеле краін Усходняй Эўропы. Па-сутнасьці, гэта была дамова аб пачатку II Сусьветнай вайны.

1 верасьня 1939 году нямецкія бомбы пачалі падаць на заходнебеларускія гарады. Тысячы беларусаў, разам з палякамі, першыя ўступілі ў бой з фашыстамі. 17 верасьня Сталін успомніў "аднакроўных братоў" беларусаў і ўкраінцаў. Згодна дамовы з Гітлерам, Чырвоная Армія ўдарыла ў сьпіну польскаму войску. Першы этап вайны скончыўся сумесным парадам саюзных войскаў у Брэсьце.

Вайна ішла сем гадоў. Пад час яе саюзьнікі сталі ворагамі. Немцы акупавалі Беларусь. За тры гады панаваньня фашыстаў на нашай зямлі было зьнішчана больш 2 мільёнаў людзей. Таму дзень вызваленьня сталіцы Беларусі ад немцаў заўсёды будзе адзначацца як сьвята!

Але пасьля вайны урад БССР не зрабіў нічога, каб выратаваць беларусаў ад сталінскіх лагераў. Больш таго, ён быў саўдзельнікам у злачынствах супраць народу. Дык прычым тут незалежнасьць?

Дз.КІСЕЛЬ.

ВАСІЛЬ НОВІКАЎ ВЫБІРАЕ "СВАБОДУ". НАСТУПНЫ ПРЫПЫНАК - НЬЮ-ЁРК?

У асяроддзі палітыкаў камуністычнай арыентацыі - вялікі крызіс, параўнальны хіба што толькі з часамі ўсеагульнай разгубленасьці ў жнівеньскія пасляпутчавыя дні 1991-га. Васіль Новікаў, адзін з лідараў беларускіх камуністаў, днямі выступіў у газеце "Свабода" (!) з рэзкай крытыкай супрацьзаконных намераў Прэзідэнта Беларусі правесьці так званы кангрэс жыхароў краіны ў якасьці альтэрнатывы парламанту. Вельмі негатыўна, В.Новікаў ахарактарызаваў планы А.Лукашэнкі правесьці чарговы плебісцыт, трапна назваўшы яго "шоў".

Пасьля знакамітай "заявы сямі" улада распачала мэтанакіраваны развал камуністычнай партыі, пагражаючы пакінуць яе кіраўнікоў без партыйнай масы. Параза Г.Зюганава зрабіла шанцы беларускіх камуністаў процістаяць развалу сваёй партыі вельмі слабымі. Першымі на саслабелых накінуліся іх былыя паплечнікі,..

Адна за другой палітычныя плыні па чарзе крута бяруць убок ад прэзідэнцкага курсу. Ніхто не жадае падзяляць з А.Лукашэнкам адказнасьць за сацыяльна-эканамічную катастрофу. Усе хочуць пасьля яго краху пачынаць з чыстага аркуша.

Але ня ўсім гэта ўдасца. Немагчыма забыць, як камуністы радаваліся, калі А.Лукашэнка нацкоўваў сваіх малют скуратавых на БНФ. Як яны натхняліся прыдуманымі "электаратам" псеўдадзяржаўнымі сімваламі. Як уцягнулі Беларусь "back in the USSA" (назад у СССР). Капалі яму нацыяналістам-капіталістам. Цяпер самі ляцяць туды дагары нагамі.

У гісторыі КПСС падобнае ўжо здаралася. Так дамагаўся абсалютнай улады Сталін. Ён прыбіраў спачатку "крутых" апазіцыянераў Троцкага, Зіноўева, Бухарына ды іншых. Потым прыйшоў час "сапраўдных ленінцаў", таму што толькі з іх боку магла зыходзіць рэальная небясьпека сталінскай дэспатыі. Разам з "сумленнымі камуністамі" пад сталінскую сякеру пайшлі чэкісты-энкавэдысты, разнастайныя пракуроры і камісары.

Так і сёньня. Прыйшоў час Новікава і Калякіна. Ці не яны зацята "з наганам у руцэ і прэзідэнтам у башцэ" тапталі кволыя парасткі грамадзянскіх свабод, незалежнасьці і патрыятызму? Пасьля вопыту фашызму і камунізму, на зыходзе XX стагоддзя, на што яны разьлічвалі, калі па-ранейшаму натхняліся казачнымі фантазіямі пралетарскіх правадыроў? Супраць дыктатараў няма іншых гарантый, акрамя грамадзянскіх вольнасьцяў, законнасьці, прыватнай уласнасьці, і, само сабой, суверэннасьці народу. Калі камуністы працягваюць думаць, што ад дыктатарскіх памкненьняў гарантыі можна знайсьці ў "Камуністычным маніфесьце" - гэта проста іх чарговая памылка.

Памылку гэтую яшчэ ня позна выправіць. Наш народ разам з камуністамі мае шанц. Бо, перш за ўсё, мы - беларусы, а астатняе - потым. Толькі я асабіста слаба веру ў імпэт камуністаў (і іх сяброў-аграрыяў). У 91-м яны разьбягаліся, як пацукі з карабля. Зараз іх, зразумела, не прываблівае персьпектыва ізноў перайсьці ў падпольле. Не жадаюць яны жыць і ў бананавай рэспубліцы.

У барацьбе з фашызмам і дыктатурай камуністы могуць даць фору любому патрыёту.

Але ж не да такой ступені, як Пазьняк, Навумчык, Хадыка і Сіўчык. Праўда, ахвярны гераізм некалі быў у камуністаў у крыві. Магчыма, штосьці яшчэ засталося...

Сяргей САМАСЕЙ.

"СТАБІЛЬНАСЬЦЬ - ГЭТА Я!"

Рэферэндум, вакол якога апошнія месяцы вяліся ледзь ня ўсе палітычныя размовы, набыў, нарэшце, рэальныя свае абрысы. Пад час візіту на Гарадзеншчыну прэзідэнт канкрэтна выклаў план правядзеньня рэферэндуму і яго сутнасьць.

Мэтай рэферэндуму, па словах А.Лукашэнкі, зьяўляецца "забесьпячэньне канстытуцыйнай стабільнасьці". Дэпутаты папярэдняга Вярхоўнага Савету зрабіць гэта, аказваецца, не змаглі. Прынятую імі "у хатніх умовах" Канстытуцыю "нельга лічыць нармальнай". Пра тое, што за гэтую "ненармальную" Канстытуцыю некалі галасаваў дэпутат, а затым і кляўся на ёй прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, чамусьці казаць не прынята. Кіруючыся прынцыпам: "Стабільнасьць - гэта я!", А.Лукашэнка толькі за сабой пакідае права зьмяняць Асноўны Закон. Бо, маўляў, атрымаюць большасьць у парламанце камуністы - пачнуць "кроить Конституцию под свою партийную линию". А прыйдуць , ня дай Бог, да ўлады "либералы, а за ними - национал-радикалы", дык на падставе прынятых імі ж законаў "половину народа упрячут в концлагеря".

Галоўнай зьменай у Канстытуцыі па замыслу Лукашэнкі павінна стаць права прэзідэнта распускаць парламант "у выпадку парушэньня Канстытуцыі". Такога ж права прэзідэнт дамагаўся ад народу і на рэферэндуме 1995 году. Гэта зьвязана з тым, што Вярхоўны Савет сёньня зьяўляецца адзінай сілай, здольнай перашкодзіць усталяваць прэзідэнту абсалютную ўладу. Больш таго, афіцыйна выяўленых Канстытуцыйным судом парушэньняў Канстытуцыі з боку Лукашэнкі дастаткова, каб назваць іх сістэматычнымі. А гэта ўжо дае права дэпутатам ставіць пытаньне аб адхіленьні прэзідэнта ад улады ўвогуле. Верны сваёй заяве "отрешить раньше, чем меня отрешат", А.Лукашэнка палічыў за лепшае наступаць, чым абараняцца. Першым крокам у гэтым наступе будзе зрыў давыбараў у парламант, пра што было заяўлена пад час выступу ў Горадні. Затым, атрымаўшы "дабро" на рэферэндуме, застанецца толькі выявіць пару лішніх цьвікоў на лецішчах дэпутатаў і з "бласлаўленьня" народу распусьціць Вярхоўны Савет.

Іншае пытаньне рэферэндуму (аб праве ўласнасьці на зямлю) непасрэдна зьвязанае з першым - зьмяненьнем Канстытуцыі. Чалавек, які мае ўласнасьць - сам сабе гаспадар. Людзі, якія ня маюць нічога (сёньняшнія калгасьнікі) - рабы сістэмы, якія будуць рабіць усё, што загадае ўлада, для таго каб выжыць. Свабодны ж чалавек дбае пра тое, каб жыць. Прычым - нармальна. Менавіта таму ў свой час бальшавікі гэтак зацята выразалі "кулакоў" і "падкулачнікаў".

Наступнае пытаньне, якое выносіцца на рэферэндум, мае таксама палітычны характар. Без адмены сьмяротнай кары немагчыма ўступленьне ў Раду Эўропы. Мяркуючы па выказваньню прэзідэнта, што скасоўваць гэтую меру пакараньня рана ("за два гады прэзідэнцтва я адхіліў усе прашэньні аб памілаваньні" - А.Л.) пасьля рэферэндуму шлях у Эўропу для нас будзе зачынены.

Самым цынічным з усіх пытаньняў, што выносяцца на рэферэндум, зьяўляецца скасаваньне існуючага сьвята Дня Незалежнасьці. Устаноўленае ў дзень прыняцьця дзеючай Канстытуцыі (27 ліпеня) сьвята сёньня як бяльмо на прэзідэнцкім воку. Няма чаго, маўляў, сьвяткаваць дзень "дрэннай" Канстытуцыі і "дрэннай незалежнасьці".

Разам з новым Днём незалежнасьці прэзідэнт зьбіраецца ўстанавіць і новы Дзень Канстытуцыі - 7 лістапада. Гэта таксама крок да стабілізацыі ў лукашэнкаўскім разуменьні. Камуністы ў гэты дзень будуць сьвяткаваць дзень рэвалюцыі, а ўсе астатнія - Канстытуцыі. Ну а ўсе разам - услаўляць "правадыра ўсіх славянскіх народаў", "кансалідаваўшага" людзей на пабудову Адзінай Вялікай Краіны. І назва гэтай краіне - Саўковія.

Вінцук МАЛЬСКІ.



© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ГРАМАДЗТВА

ДАВАЙ ЗАКУРЫМ, ТАВАРЫШ, ПА АДНОЙ...

У ліпені Міністэрства гандлю выдала загад правесьці інвентарызацыю ўсіх наяўных цыгарэт айчыннай вытворчасьці. Як гэта зрабіць? Толькі выносячы ўсе цыгарэты з гандлёвых залаў у падсобкі ды на склады. Такім чынам з продажу ў адзін момант зьніклі "Прыма" і "Астра", "Гродна" і "Космас". І, нават, "Беламорканал". Гандляры завучылі адно: фабрыка на рамоньце!

Ну і што, калі нават на рамоньце? Гарадзенская тытунёвая фабрыка, як гэта пацьвярджалася шмат разоў, мае цяжкасьці са збытам, бо рынак завалены імпартнымі цыгарэтамі. Таму абавязкова павінны быць вялікія запасы. І яны ёсьць! А ў продажы няма. Дэфіцыт створаны штучна.

Самае пікантнае, навошта спатрэбілася інвентарызацыя? А дзеля высьвятленьня "легальнасьці вырабу айчынных цыгарэтаў на тэрыторыі Беларусі".

Даляры можна кляпаць на ксэраксе. Фальшывую гарэлку можна разьліваць дзе-небудзь у гаражы. Але дзе, на чым, з чаго можна патаемна вырабляць "Беламор"? У чыіх запаленых мазгах магла нарадзіцца такая прапанова?

Падумаем разам. Хоць і ёсьць цяжкасьці са збытам, аднак маса людзей курыць гарадзенскія цыгарэты з прычыны іх таннасьці. Зараз не 1992 год, калі цыгарэты адпускаліся па картках, хатніх запасаў ніхто не трымаў. І раптоўна яны адначасова зьніклі. Курыльшчыкі міжволі перайшлі на імпартныя, якія даражэйшыя разоў у 5, а то і ў 10.

Дык каму ж гэта ўсё было выгадна? Правільна, тым, хто гандлюе імпартнымі цыгарэтамі. Уявіць толькі, на некалькі тыдняў адключыць канкурэнта, гэта ж шматмільярдны гешэфт! Вось яна, сапраўдная, а не прыдуманая карупцыя, каранямі ўваходзячая ў Міністэрства гандлю, ва ўрад. Нават айчынную галіну не пашкадавалі!

З гэтым красамоўна перакрыжоўваецца нядаўні прыезд А.Лукашэнкі на гарадзенскую "табачку". Кіраўніцтва фабрыкі з гонарам паведаміла госьцю, што знайшло амерыканскую фірму, якая гатовая ўкласьці ў рэканструкцыю ажно 68 мільёнаў даляраў. Але таварышу прэзідэнту гэта зусім не спадабалася. Маўляў, самі "запусьцім"! "Запускалі" ўжо... Дзяржава, вядома, ніколі і нідзе ня знойдзе такіх грошай. Дый навошта шукаць, калі ў верхніх эшалонах ёсьць нехта, хто дае зялёнае сьвятло для імпартных цыгарэт на шкоду ўласнай вытворчасьці?

Д.ЛЕВАНОВІЧ.

ПЫТАЛІСЯ - АДКАЗВАЕМ

На падставе якога дакумента пенсіянеры карыстаюцца правам бясплатнага праезду ў гарадзкім транспарце?

М.Радзішэўская.

Згодна з Указам Прэзідэнта пенсіянеры маюць права праезду ў прыгарадным транспарце бясплатна ў тэрмін з 1 па 31 траўня і з 1 па 30 верасьня 1996 году.

17 чэрвеня гэтага году абласны выканаўчы камітэт прыняў рашэньне распаўсюдзіць права бясплатнага праезду на ўдзельнікаў вайны і інвалідаў I і II груп. Пакуль грошы ёсьць у бюджэце вобласьці на выплату датацыі транспартнікам, гэтыя ільготы будуць захоўвацца.

Што тычыцца гарадзкога транспарту, то пенсіянеры карыстаюцца 50% ільготнай скідкай. Права на бясплатны праезд у горадзе, уведзенае ў свой час Вярхоўным Саветам, адменена Ўказам Прэзідэнта.

РЭСУРСЫ Ў ВОЙСКІ ПАСТАЎЛЕНЫ

Вясновы прызыў, які ў гэтым годзе доўжыўся дольш, чым звычайна, у сувязі з прэзідэнцкай адтэрміноўкай для навучэнцаў ПТВ, нарэшце скончыўся. Яго вынікі па Горадні "ПАГОНЯ" папрасіла пракаментаваць Гарадзенскага ваенкама палкоўніка Барыса Скобелева.

- Усе запланаваныя рэсурсы ў войскі пастаўлены. Было прызвана каля 700 чалавек. Па стану здароўя атрымалі адтэрміноўку 139 хлопцаў, 76 - для працягу адукацыі, яшчэ 22 чалавекі ў сувязі з цяжкім сямейным становішчам будуць прызваныя пазьней.

- "Ўкланісты" былі?

- Спачатку было 5 юнакоў, якія ўхіляліся ад прызыву. Двое з іх знойдзены. Аказалася, што яны таксама мелі права на адтэрміноўку. На сёньняшні дзень засталося 3 чалавекі, матэрыялы адносна якіх перададзены ў праваахоўныя ворганы.

- Шмат размоваў ходзіць пра будучыя зьмены ў прызыўной кампаніі...

- Мы ўсе чакаем новага Закона аб вайсковай службе. Магчыма, яго прымуць на восеньскай сесіі Вярхоўнага Савету. Урадам праект ужо ўхвалены. Згодна з гэтым дакумантам, прызыва ў сучасным выглядзе ня будзе. З кожным прызыўніком будзе весьціся індывідуальная праца. Як толькі юнаку споўніцца 18 год, мы яго выклічам у ваенкамат, правядзем медыцынскае абсьледаваньне. Калі ён не карыстаецца правам на адтэрміноўку, мы падаем дадзеныя ў Міністэрства абароны. Ужо адтуль будзе паступаць пісьмовае прызначэньне на месца службы.

Гутарыў Сяргей САМАСЕЙ.

ЧАЎНАКАМ ПЕРАКРЫВАЮЦЬ КІСЛАРОД

З 12 жніўня ўстаноўлена мытная пошліна ў памеры 50% ад кошту прывазной мэблі. Пошліна тычыцца фізічных асобаў, гэта значыць, простых грамадзян, якія набылі мэблю за мяжой.

Многія жыхары вобласьці карысталіся магчымасьцю купіць у Польшчы наборы мэблі для кухні ці залы, паколькі цэны на іх там значна ніжэйшыя пры цалкам някепскай якасьці. Для некаторых падобны гандаль быў адзінай крыніцай існаваньня. Дзяржава ў чарговы раз нанесла ўдар па маленькіх людзях і іх маленькаму бізнэсу.

С.С.

"ДАРОГА ДА ЎЗАЕМНАСЬЦІ"

Канферэнцыя пад такой назвай адбудзецца ў Новым каралеўскім замку ў Горадні 14 верасьня. Ладзяць яе Саюз Палякаў Беларусі сумесна з беларускім Грамадзка-Культурным Таварыствам з Беластока.

В.АНІМУЦКІ.

ХТО Ў НАС "ЗАЯЦ"?

Тыя, каму за 30, памятаюць, як у грамадзкім транспарце езьдзілі кандуктары. У сваіх сумках яны трымалі рулончыкі білетаў і медзякі. Потым кандуктараў замянілі маленькія касы самаабслугоўваньня ды кампосьцеры. З тых часоў кожны савецкі чалавек хоць аднойчы езьдзіў "зайцам".

Сёньня праблема "зайцоў" набыла адметны зьмест. І не разьбярэш, хто больш "заяц": ці той, хто езьдзіць, ці той, хто возіць.

5 жніўня, прыкладна а 16-й гадзіне ў гарадзенскім тралейбусе трэцяга маршруту яшчэ на прыпынку "Плошча Савецкая" пасажыры папярэджвалі адзін другога, што на прыпынку каля кафэ "Рамантыка" кантралёры ловяць "зайцоў". Сапраўды, за тралейбусным прыпынкам стаяў аўтобус, так бы мовіць, перасовачная база кантралёраў. Самі яны разам з двума супрацоўнікамі міліцыі блакавалі дзьверы тралейбусаў і праводзілі дагляд пасажыраў. Вось на тратуары стаіць кабета-пенсіянерка. Кантралёры прымушаюць яе плаціць штраф, альбо ў будучым вылічаць з пенсіі 100 тысяч рублёў.

Вось папаўся пасажыр з падробленым на каляровым ксэраксе праязным. Такіх падробак у кантралёраў цэлыя кішэні. Міліцыянт потым расказаў карэспандэнту "ПАГОНІ", што ў аднаго з "зайцоў" адабралі нават талон, намаляваны алоўкамі.

Транспартнікаў зразумець можна. Іх гаспадарка прыносіць адныя страты. Але ёсьць падставы паглядзець на сітуацыю вачыма пасажыраў, у тым ліку, безьбілетных.

Чаму, скажыце, ня ходзяць аўтобусы з 11 да 15 гадзін? Які можа быць даход і прыбытак у таго, хто не працуе палову рабочага дня? Калі людзі ходзяць пехатою ці карыстаюцца таксі, то гэта ў касу аўтапарку грошай не дадае. Дзіўны спосаб падвышаць фондааддачу абралі гарадзенскія аўтобусьнікі.

Ледзь ня кожны дзесяты працоўны не атрымлівае своечасова заробку. Затрымлівае заробкі не які-небудзь "камерсант-гніда", а дзяржава - уласьнік прадпрыемства ці ўстановы. Атрымліваецца, як сьпіну гнуць задарма - гэта па закону, а як выйшаў за прахадную - так і стаў "зайцам"?!

Ва ўсіх краінах грамадзкі транспарт працуе, як гадзіньнік. У іх няма дзяржаўнай манаполіі і рынак пасажырскіх перавозак цалкам забясьпечвае патрэбы пасажыраў. Праблемы "зайцоў" там не існуе. Дарэчы, гарадзенскія маршруты, якія возяць людзей на оптавы рынак, праблемы "зайцоў" ня ведаюць. Яна мае месца там і ў тых, хто ня ў стане арганізаваць гарадзкую гаспадарку на карысьць жыхарам.

Ну, спадарства, і хто сярод нас "заяц"?

Сяргей САМАСЕЙ.

"СЭВЭКС" - ПЕРШЫ БАНКРУТ

Гаспадарчы суд Гарадзенскай вобласьці вынес рашэньне аб прызнаньні факту банкруцтва сумеснага беларуска-нямецкага прадпрыемства "Сэвэкс". У вобласьці гэта першы выпадак прызнаньня прадпрыемства банкрутам.

Працэдуру аб прызнаньні банкруцтва ўзбудзілі самі кіраўнікі "Сэвэкса", паколькі апынуліся ў стане поўнай неплацёжаздольнасьці. Экспертыза, прызначаная судом, устанавіла, што прычынамі краху зьявіліся адсутнасьць матэрыяльных актываў і абаротных сродкаў, перадача крэдытаў нямецкаму партнёру – фірме "Weindok import-export" і іншым фірмам, непрыняцьцё мер па своечасоваму спагнаньню запазычанасьці.

Агульная запазычанасьць "Сэвэкса" крэдыторам склала суму ў 4 727 416 000 рублёў. На момант вынясеньня рашэньня ў "Сэвэкса" не было ніякай маёмасьці, што не дазваляла разьлічыцца нават з супрацоўнікамі ліквідуемага прадпрыемства.

С.С.

СУПОЛЬНІЦТВА: ЦІ БУДЗЕ ПЛЁН?

Каб хоць на кароткі тэрмін адцягнуць увагу працоўных ад праблем выжываньня, кіраўніцтва Беларусі амаль кожны дзень гаворыць пра карысьць для Беларусі, як панацэю ад жабрацтва, заключанага дагавору з Расеяй аб стварэньні Супольніцтва.

Але, калі прааналізаваць падзеі ў Беларусі за апошнія некалькі год, можна прыйсьці да высновы, што дагавор ня мае ніякай персьпектывы. Больш таго, падобныя папулісцкія дамовы падаўляюць ініцыятыву людзей і прадпрыемстваў у пошуках выйсьця.

Большасьць прадпрыемстваў Беларусі мае значную запазыку. Мяркуючы па статыстыцы, дрэнна жыве і асноўная частка працоўных. Па апытаньню моладзі ў Магілёўскай вобласьці, да 43% маладых сем'яў маюць даўгі і толькі 14% ня маюць матэрыяльных праблем.

Заключэньне ж дагавору, як гэта было і раней, усяляе нейкую надзею, што Расея дапаможа пракарміць нас шляхам зьніжэньня цэнаў на энерганосьбіты і г.д. Як вы памятаеце, прыкладна з верасьня 1993 году ўрад Кебіча дурыў нам галовы дамовай з Расеяй аб адзінай рублёвай зоне, з абменам беларускіх рублёў на расейскія па курсу 1:1. Як гэта падзейнічала? Усе амаль што кінулі працаваць, чакаючы гэтай "зоны", спадзяючыся на яе, як на панацэю. І з гэтага моманту пачаўся катастрафічны абвал беларускай эканомікі, які працягваецца і сёньня. Ну а мімаходам, у 1994 годзе, беларускі народ абмяняў Кебіча на Лукашэнку. На жаль, па курсу 1:1, бо працягваецца тая ж палітыка, з прыярытэтам на Усход.

Персьпектывы супрацоўніцтва з Расеяй не такія бясспрэчныя, як малюе Адміністрацыя прэзідэнта. У мінулым годзе, калі ўжо не было ніякіх абмежаваньняў у гандлі, экспарт у Расею прадукцыі ў супастаўных цэнах зьнізіўся ў параўнаньні з 1994 годам на 21%. У той жа час таваразварот з Чэхіяй, Літвой узрос у 5 разоў, з Германіяй - на 52%, з Польшчай - на 90%, Канадай - у 2 разы, ЗША - на 42%, Кітаем - у 2 разы.

Як бачым, эканоміка Беларусі фактычна інтэгруецца ва ўвесь сьвет. Схіленьне яе палітычнымі сродкамі прыярытэтна на усход зьяўляецца тармазячым фактарам.

Алесь ДЗЕРГАЧОЎ.

НОВЫ ІМПУЛЬС ПРЫВАТЫЗАЦЫІ

Прыватызацыя. Як часта сёньня можна пачуць гэта слова. Нават недасьведчаны чалавек разумее, што гэта ня проста абстрактная перадача чагосьці ў прыватныя рукі, а зьяўленьне прыватных магазінаў, кафэ, цырульняў. Прыватызацыя - альтэрнатыва дзяржаўнай маёмасьці, часта закінутай і занядбанай.

МАЛАЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ

Адбудаваць разбуранае, прымусіць працаваць стратнае - такія мэты прыватызацыі. Яна таксама здольна палепшыць становішча ўстойлівых прадпрыемстваў, даць ім магчымасьць працаваць больш эфектыўна.

Прыняты 17 ліпеня гэтага году Закон "Аб унясеньні зьмяненьняў і дапаўненьняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па пытаньнях раздзяржаўленьня і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасьці" адкрывае больш шырокія магчымасьці прыватызацыі.

Згодна Закону, да канца 1997 году павінны быць прыватызаваны ўсе прадпрыемствы гандлю, грамадзкага харчаваньня і бытавога абслугоўваньня. Да пачатку 1998 году падлягаюць разьдзяржаўленьню прадпрыемствы будаўнічай галіны, лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці, а таксама тыя, што перапрацоўваюць сельскагаспадарчую прадукцыю. Да 1 ліпеня 1999 году павінна быць завершана бяскоштная чэкавая прыватызацыя. Устанаўленьне такіх сьціслых тэрмінаў выклікана тым, што прыватызацыя раней праводзілася вельмі марудна. Беларусь па тэмпах прыватызацыі займае адно з апошніх месцаў, побач з Узбекістанам і Азербайджанам.

Што дапаможа ажыцьцяўленьню гэтых планаў?

Па новаму Закону, вялікая роля надаецца аўкцыёну, паколькі ён зьяўляецца найбольш хуткім спосабам пераходу ўласнасьці ў рукі сапраўднага гаспадара, а таксама таму, што на аўкцыёнах перамагае той, хто можа ня толькі заплаціць найвялікшую цану, але і найлепей распарадзіцца ўласнасьцю.

Ня меншую ролю заклікана адыграць норма, якая дазваляе зьніжаць першапачатковы кошт аб'ектаў у залежнасьці ад экалагічнай сітуацыі і іншых умоваў рэгіёну. Гэта дазволіць буйным, вельмі дарагім аб'ектам знайсьці новых гаспадароў.

Законам адменена абавязковая аплата 50% кошту ўсіх прыватызаваных аб'ектаў чэкамі "Маёмасьць". Для паскарэньня працэсу бяскоштнай прыватызацыі прадугледжана, што да 1 студзеня 1997 году павінен быць зацьверджаны пералік прадпрыемстваў, чые акцыі будуць цалкам альбо часткова прададзены за чэкі. Такім чынам, трымальнікі чэкаў набудуць долю дзяржаўнай маёмасьці.

Зьмяненьні заканадаўства павінны надаць імпульс для энергічных дзеяньняў мясцовым ворганам улады. Пасьля некалькіх гадоў таптаньня на месцы, пасьля чаканьня кіруючых дырэктыў створана магчымасьць для паскарэньня прыватызацыі - працэсу, які, безумоўна, стымулюе будучы эканамічны рост нашай краіны.

СТАБІЛІЗАЦЫЯ ЦІ ЗАСТОЙ?

У траўні-чэрвені 1996 году Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў правёў апытаньне насельніцтва краіны. Мэтай дасьледаваньня быў аналіз зьменаў матэрыяльнага становішча людзей за апошнія гады.



Вынікі апытаньня сьведчаць, што больш паловы насельніцтва краіны штогод адзначаюць пагаршэньне свайго матэрыяльнага становішча. Нягледзячы на тое, што ў 1996 годзе колькасьць людзей у краіне (за выключэньнем Гарадзеншчыны), якія адзначылі пагаршэньне, у параўнаньні з папярэднімі гадамі, зьменшылася (64,8% у 1995 г. і 57,4% у 1996 г.), казаць пра стабілізацыю нельга. Бо зьменшыўся і працэнт людзей, якія сталі жыць лепш (9,4% у 1995 г. і 6% у 1996 г.).



© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

26, ПАНЯДЗЕЛАК

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль.
7.50 Экономикст.
8.00 Мультфильмы.
8.20 "Экзамен на директора". Х/ф.
9.40 Темная комната.
10.10 Финансовое время.
15.00 Новости.
15.15 "Флиппер".
15.40 Мультфильмы.
16.05 "Настанет свой черед". Т/ф.
17.05 На добрый лад.
17.20 "Познай себя".
17.50 Музыкальный антракт.
18.00 Финансовое время.
18.25 Экономикст.
18.35 MTV.
18.50 Новости.
19.05 "Крок".
19.40 "Это мы не проходили...".
19.55 Белорусский дом.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.45 Спортивный телекурьер.
22.05 Х/ф "Дорогой мой человек".
23.50 Мотоспорт. Супербайк. Чемпионат мира-96.
0.20 Новости.

ГРОДНО:

17.20 Премьера кино.
18.20 Неделя.

ОРТ

8.00 Новости.
8.15 "Новая жертва".
9.05 Поле чудес.
10.05 Человек и закон.
10.30 Угадай мелодию.
11.00 Новости.
11.10 "Сохрани себя".
11.50 "Четыре танкиста и собака".
12.50 "Виктор Михайлов. Чтобы помнили..."
13.30 Любовь с первого взгляда.
14.00 Новости.
14.20 "Рыцарь Отважное Сердце".
14.45 Марафон-15.
15.00 Звездный час.
15.40 "Элен и ребята".
16.05 Джэм.
16.30 "Вокруг света".
17.00 Новости.
17.20 "Новая жертва".
18.10 Час пик.
18.35 Угадай мелодию.
19.00 Если...
19.45 Спокойной ночи, малыши!.
20.00 Время.
20.40 "Багз — электронные жучки". "Невидимые убийцы".
21.45 "Серебряный шар".
22.25 Новости.
22.35 "Линия кино". "Шамара".

Канал "Россия"

16.00, 19.00, 22.00, 23.10 Вести.
16.20 Музыка всех поколений.
16.35 Зависит от тебя.
16.50 "Челленджерс".
17.20 Тележурнал "Охрана труда".
17.30 L-клуб.
18.15 Момент истины.
19.30 "Санта-Барбара". Х/ф.
20.25 Джентльмен-шоу.
20.55 Погода на завтра.
21.00 Хоккей. Кубок мира. Швеция — Германия.
23.00 Новинки от "ТВ-медиа".
23.25 Со скоростью звука.

Санкт-Петербург

16.55, 18.55, 22.05 Информ ТВ.
17.05 "Философия по Филу".
17.30 Стиль жизни.
17.35 "Экстрасенс". Х/ф. Ч. 2.
18.40 Большой фестиваль.
19.15 Спорт.
19.20 "Первая любовь".
20.10 Фортепианные пьесы.
20.40 Телеслужба безопасности.
20.55 Спортивное обозрение.
21.05 "Камо грядеши". Х/ф.
22.25 "Город". Х/ф.

IV канал, НТВ

17.00 Д/ф "Дикая природа: борьба за жизнь".
17.30 Футбольный клуб.
18.00, 21.00, 23.20 Сегодня.
18.35 Д/ф "Охота за похитителями атомных секретов" сериала "Шпионы".
19.00 Х/ф "В первый раз".
20.30 "Конюшня роста. Возлюби".
Усе зьвесткі дадзены па стану на 20 жніўня.

СП "Альфа-100", т. 33-12-52, **апрачоўшчыцы краветак** (гібкі графік працы, 20 жанчын).

Асацыяцыя Гроднарамбуд, т.33-32-17, 33-72-55, **рыхтоўшчык кузавоў** (3 чалавекі), з-та 1 млн., **прараб** для працы ў Расеі, з-та каля 4 млн.; **цясьляр** (4 разрад, 4 чалавекі); **муляр** (4-5 разрад, для працы ў Расеі), з-та каля 3 млн.; **дырэктар па будаўніцтву** (са стажам працы прарабам).

Гархарчгандаль, т.72-01-90, **маляр** (5 разрад).

Гарпладгароднінагандаль, т. 6-83-98, **трактарыст; сьлесар-рамонтнік па халадзільным абсталяваньні; кіроўца электрапагрузчыка** (абавязкова пасьведчаньне); **сьлесар па рамонту аўтамабіляў; сьлесар КВПіА; аператар газавай кацельнай** (мець пасьведчаньне).

Дом тэхнічнай творчасьці, т.44-64-19, 44-60-50, **кіраўнікі гурткоў** па наступных накірунках:
- аплікацыя саломкай
- ручны выраб дываноў
- ручное ўзорнае ткацтва
- мастацкая вышыванка
- вязаньне
- кравецтва
- вытворчасьць мастацкіх вырабаў са скуры
- разьба па дрэву
- інкрустацыя
- роспіс па дрэву
- тэхнічнае канструяваньне і мадэляваньне
- выяўленчае мастацтва і інш.

Патрабаваньні: вышэйшая адукацыя.

ПМК Гроднааблагрmaрамбуд, т.2-35-71, **тынкоўшчык** (4 разрад, 5 чалавек), з-та 1 млн. 200 тысяч; **муляр** (4 разрад, 5 чалавек), з-та 1 млн. 200 тыс.

ПМК Аблспажыўсаюза, т.44-94-40, 44-95-56, **столяр** (4-5 разрад), **маляр** (3-4 разрад), **бляхары, плітачнікі** .

МП "Сплаў", т.44-53-72, **бляхары па мяккай блясе; муляры; тынкоўшчыкі; маляр.**

ВВП Глухіх, т.72-06-14, **электрагазазваршчык** (патрабуецца інвалід); **муляр-пячнік** (патрабуецца інвалід).

Заапарк, т.47-28-86, 47-28-38, **ветурач.**

ЖРЭУ Кастрычніцкага раёну, т.2-10-57, **пячнік**, з-та 900 тыс.рублёў.

Абласная клінічная бальніца, БЛК, 52, **сьлесар-рамонтнік пральнага абсталяваньня**, з-та 356 тыс.рублёў.

МП "ДВС", т.33-44-07, **вязальшчыцы на машыны** 10,5,3 класа (3 чалавекі), з-та 700 тыс.рублёў.

Міжгаспадарчы сельскі будаўнічы камбінат, т.2-50-12, 2-12-77, **муляры** (сезонная праца, ёсьць службовы транспарт).

Абарончыя ралеты, жалюзі. **Тэл: 47-87-86.**

Шведзкія жалюзі. **Тэл:47-18-90**

БЕЛОРУССКИЙ ФОНД СОРОСА

объявляет конкурс проектов
на получение разовых грантов
"ФУНДАМЕНТАЛЬНЫЕ НАУКИ В КОНВЕРСИОННЫХ ТЕХНОЛОГИЯХ"
в рамках программы
ПОДДЕРЖКА ФУНДАМЕНТАЛЬНЫХ НАУК

На конкурс принимаются проекты по следующим направлениям:

- **Высокоэнергетические процессы: их разработка и использование**
- **Информационные и управляющие системы: теория, функционирование, материалы**

Программа поддерживает научные коллективы и отдельных ученых.
К рассмотрению принимаются проекты, находящиеся в стадии разработки, имеющие финансирование и не являющиеся законченными научно-исследовательскими работами.

Присланные на конкурс материалы не становятся собственностью Белорусского Фонда Сороса, не публикуются и не передаются третьим лицам без ведома авторов.

Внимание! Материалы, подаваемые на конкурс, рассматриваются только при наличии экспертного заключения о возможности их опубликования в открытой печати.

Проекты на конкурс подаются в виде заявок на грант по форме, которую можно получить в Белорусском Фонде Сороса или в его областных отделениях:

220027 г. Минск, пр.Ф.Скорины, 65, корпус 11А БГПА, комн.107, Белорусский Фонд Сороса

210026 г. Витебск, ул. Замковая, 4, комн. 215, Витебское отделение БФС

246652 г. Гомель, ул. Кирова, 32-а, Гомельское отделение БФС.

Заявки высылаются по указанному выше адресу Белорусского Фонда Сороса, с пометкой на конверте "Программа поддержки фундаментальных наук".

Заявки, поданные не по форме, не рассматриваются.

Последний срок подачи заявок – **20 октября 1996 года.**

С вопросами обращайтесь по телефонам: (017) 232-80-92, 232-77-13, 232-70-64

©Голографика 060

ПРАДАЮ

* дзіцячы ложак б/у у добрым стане. Тэл. **2-46-25**
* газавую аўтаматыку АПОК-**20**, бензабетонамяшалку, сантэхкабіну (усё таньней, чым з прадпрыемства). Тэл. **39-03-96**
* жаночы новы плашч, памер **58** рост **164**. Тэл. **33-09-55**
* новую падольскую ручную швейную машыну. Тэл. **47-80-99**
* запчасткі ВАЗ-**2106**: правае пярэдняе крыло, правая задняя дзьверка, правая жалезная рашотка, прычэпнае прыстасаваньне. Тэл. **55-4-66**
* матацыкл "Ява-**350**" **12** вольт, чугунныя батарэі ацяпленьня, уцяпляльнік ліставы **1** куб. Тэл. **44-88-28**
* а/м Фольксваген-Сантана, **1984** г.в., **85** KW - $ **2 800**, беларускія нумары.
* вельмі танна агульныя сшыткі фарматам **21х35** розных колераў. Тэл. **33-07-48**
* **3**-пакаёвую кватэру чэшскай планіроўкі, **9** паверх **9**-павярховага дома, пл. **43/76**, $ **19 500**. Тэл. **33-91-42**
Тэл. (**8-215**) **28-1-54** пасьля **20.00**
* кінескоп **61** ЛК **4**Ц, эл. пастух, блок цыліндр. Г-**24**, прычэпныя "Опель". Тэл. **47-33-66, 47-33-60**
* жаночую і мужчынскую вопратку (б/у у добрым стане танна), сілікатныя блокі, цэглу. Тэл. **39-90-92, 33-45-32**
* пішучую машынку механічную партатыўную (новую) з расейскім і украінскім шрыфтам. Тэл. **44-67-62**
* сетку ацынкаваную шыр. **2**м., аўтапрычэп "зубраня", эл.вентылятар для гаражоў, амбараў, майстэрняў; дачу ў в.Жылічы (дом **10х5** м недабудаваны). Тэл. **72-45-86**
* металічны гараж **3х6** м - $ **500**. Тэл. **44-29-20**
* аўтамабілі ГАЗ-**2410** "Волга", "Масквіч-**412**" **1988** г.в. Тэл. **45-45-57** з **8** да **17**, **31-92-91** з **18**
* пральную машыну "Рыга-**17** М", б/у, танна. Тэл. **31-47-30**
* акуляры лекава-прафілактычныя дзірчатыя лазер "Віжн" ЗША. Тэл. **6-57-19**
* запчасткі да матацыкла "Іж-Юпіцер-**4**". Тэл. **6-26-91**, пасьля **18.00**, акрамя выходных
* электрычная шафа новая. Тэл. **72-65-54**
* заслоны новыя белыя прыгожыя на кухню (**1** камплект - **3** шт.) танна. Тэл. **6-69-65**
* блок-сьценку "Леда" сьветлы арэх, ложак-канапу, стол-кнігу, трыльяж, мяккія крэслы **2** шт., халадзільнікі "Марозка", "Іней", "Крыштал", эл.пліту з духоўкай (усё новае), зямельны ўчастак пад будаўніцтва катэджа, **15** сотак у в.Лапенкі (танна). Тэл. **31-86-43**
* камплект сполярaў "Карлота" з установкай,: электрашклопад'ёмнікі да ВАЗ-**08,09,093,099**, бамперы М-**2141**. Тэл. **44-96-69** (увечары)
* запчасткі да айчынных аўтамабіляў. Тэл. **2-82-94**
* дачу ў Віцебску, матор ЯМЗ-**236**, матор лодачны, дрэль электрычную, палатку **2**-асабовую, габелен электрычны, радыятар да УАЗ, капот да "Масквіча", праўка гідраўлічная, абліцоўка да ЗІЛа альбо памяняю на грузавы аўтамабіль ці трактар. г.Глыбокае, Віцебская вобл., **2-20-17**.
* мяккі куток вялюравы прыгожы з Польшчы - $ **290**. Тэл. у Ваўкавыску **2-46-30**
* настойку грыба "Вясёлка" ад ракавых пухлін. Тэл. **45-45-57** з **8** да **17**, **31-92-91** пасьля **18** гадзін
* футра з меха нутрыі памер **46-48**. Тэл. **5-02-50**

КУПЛЮ

* радыё бязправаднае трохпраграмнае нядорага. Тэл. **5-17-23**
* матацыкл "Ява", цяжкі матацыкл, беньзін. Тэл. **93-53-70** (хатні), **47-59-75** (працоўны)
* замежныя футбольныя часопісы ці даведнікі. Тэл. **72-29-96** (Віктара)
* **2**-х альбо **1**-пакаёвую кватэру. Тэл. **33-46-10**
* дом у Горадні, асобны, невялікі, можна без выгод не даражэй $ **3 000**. Тэл. (**238**) **2-22-07**, г.Ліёзна, Віцебская вобл.

МЯНЯЮ

* частку дома (**3** пакоі) пл. **42/55**, асобны ўваход, прыродны газ, каналізацыя, цяпліца на **3**-пакаёвую кватэру. Горадня, зав.Шышкіна, д.**2** кв.**2**
* гладзільную машыну "Калінка" на шкаф трохстворчаты з антрэсолямі ці прадаю. Тэл. **6-81-29** з **17** да **20**
* пакой у камунальнай кватэры г.Верхнядзьвінска (балкон, усе выгоды) на частку дома ў Віцебскай вобл. ці кватэру без выгодаў. Тэл. у Верхнядзьвінску **2-28-49**
* **4**-пакаёвую кватэру, **2** паверх, тэлефон, пл.**51,1/86,2** на дзьве кватэры. Прапаноўваць любыя варыянты. Тэл. **31-69-42**.

ПАСЛУГІ

* рамонт кватэр. Тэл. **72-56-32**
* Нямецкая мова: кантрольныя студэнтам, урокі, пераклады. Тэл. **47-32-06**
* Таніраваньне шкла аўтамабіляў стужкай заказчыка. Тэл. **47-17-65** з **17.00** да **18.00**, акрамя выходных
* Англа-амерыканская мова. Тэл. **44-86-00**
* Дасьведчаны настаўнік ангельскай мовы з вялікім стажам працы дапаможа школьнікам ўсіх узростаў у вывучэньні школьнай праграмы. Тэл. **33-65-48**
* Кузаўныя работы, сварка, рыхтоўка, падрыхтоўка да пакраскі. Тэл. **45-45-57** з **8** да **17**, **31-92-91** пасьля **18**
* Вяжу на сьпіцах з нітак заказчыка. Тэл. **6-57-19**
* Абліцоўка. Тэл. **5-91-57**
* Эфектыўны сродак для аздараўленьня і барацьбы з лішняй вагой бацькам і дзецям. Тэл. **6-25-87** з **8.00** да **10.00**
* Рамонт: парасонаў, роваряў, калясак, эл.бытавых прыбораў; заточка: ножніц, нажоў (мясарубкі, кафемолкі, шынкоўкі і г.д.). Тэл. **6-45-74**
* Вытворчасьць мягкай мэблі на заказ. Тэл. **45-45-57**

Осуществляем регистрацию вновь создаваемых и перерегистрацию действующих предприятий всех форм собственности. тел. **72-15-59, 44-14-20**.

РОЗНАЕ

* здаю пакой у цэнтры горада. Тэл. **72-09-63**
* Дзяўчына, пасьля заканьчэньня Мінскага Дзяржаўнага інстытуту замежных моў, шукае працу. Працоўны тэлефон: **47-83-85**.
* Аддам кацянят добрым людзям. Тэл. **2-83-06** з **9** да **11**
* Прапаную кнігу аднаго з найбольш удачлівых амерыканскіх прадпрымальнікаў М.Смола "Як рабіць грошы". Заяўка + канверт са сваім адрасам. **222210**, г.Смалявічы, п/с **36**
* Шукаю месца працы ў прадпрыемствах грамадзкага харчаваньня, заг.вытворчасьці, повар **5** разарду, адміністратар, дасьвед **19** гадоў. Добрасумленная, працавітая. Жыву ў Менску ў Кастрычніцкім р-не, тэл.**26-44-67**, **29-54-76**, Іна Віктараўна.
* Прапаную рэцэпты народнай медыцыны ад алкагалізму. Заяўка + канверт са сваім адрасам. **222210**, г.Смалявічы, п/с **36**
* Шукаю амататараў, інфармацыю і ўсё, што датычыцца "Арміі каханкаў" ("Army of Lovers"). **220109**, Менск, Сосны, д.**12**, корп.**1**, кв.**56**, Віка Радзіеўская.
* Маю патрэбу ў сямейным інтэрнаце. Прапановы: Гродна-**25**, галоўпаштамт, а/с **114**
* Работа дома СКВ ад школьніка да пенсіянера. Ад вас - запрос + канверт з а/а. Горадня, галоўпаштамт п/п III-ДР N **616352**
* Шукаю працу дома. Тэл. **44-76-68**
* Шукаю працу тэлефоннага дыспетчара. Тэл. **6-69-65** ў любы час.
* Дыплом N **039090** на ВІЛЬБІК Таццяну Вацлаваўну лічыць несапраўдным.

ЗНАЁМСТВЫ

* Мужчына **41** год пазнаёміцца з жанчынай для сустрэч. Горадня, **230023**, пашпарт I-ДР N **676448**
* Малады мужчына **36/178/80** пазнаёміцца з сімпатычнай жанчынай **25-30** гадоў. Жыльлём забясьпечаны. Магчымы шлюб. Пісаць на адрас: г.Менск, вул.Слабарская, д.**37**, кв.**242** (**220098**). Фота абавязкова.
* Удава **49** гадоў пазнаёміцца з сумленным мужчынам для сур'ёзных намераў. **230023**, Горадня-**23**, п/п II-ДР N **679035**

☎ 72 - 29 - 96

Прыватныя бясплатныя аб'явы прымаюцца ў нас і па тэлефоне кожны дзень, акрамя суботы і нядзелі.

ПУБЛІКАЦЫЯ — У ПЯТНІЦУ.

КУПОН - ПРЫВАТНАЯ АБ'ЯВА



20 Імя і прозьвішча .....
Адрас (тэлефон) .....
Рубрыка .....
Тэкст .....

БЯСПЛАТНА

Выразаны купон з тэкстам аб'явы адпраўце поштай, альбо прынясіце ў рэдакцыю самі.

ПАГОНЯ
230023, Горадня, вул. Дамініканская,1

АО "ДИНА"

ПРОИЗВОДСТВО АВТОМОБИЛЬНЫХ ФИЛЬТРОВ:



* воздушные для автомобилей - ВАЗ, "Таврия", "Ока", М-2141, Волга УАЗ, ЯМЗ-328, ЯМЗ-840, КАМаЗ
* масляные для автомобилей - ВАЗ6 М-412, Волга-24, УАЗ.
Двигатели - 8ДМ21, ЯМЗ - 32236.
* топливные для автомобилей - двигатели тепловозов, ЯМЗ.

230025, Гродно, ул.Белуша, 45
КОНТАКТНЫЕ ТЕЛЕФОНЫ: 47-85-22, 45-33-46, 47-83-14.

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

КУЛЬТУРА

УЛАДЗІМІР КАНАНОВІЧ:

"ГІСТОРЫК НЕ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЗАКЛАДНІКАМ ФАКТУ"

Уладзіміра Канановіча ў Горадні ведаюць даўно. Ён з тых студэнтаў-"васьмідзесятнікаў", што, выйшаўшы з "гнязда Ткачова", абралі сваім крэда карпатлівую працу на глебе гісторыі. Закончыўшы Гарадзенскі універсітэт, асьпірантуру ў Менску, Канановіч падаўся "па навуку" за мяжу. Каб праз год вярнуцца. Сёньня Уладзімір - госьць нашай рэдакцыі.

- Уладзя, ты аж з Вугоршчыны "туманнай прывёз вучонасьці плады"...

- Прайшоўшы даволі жорсткі адбор, я апынуўся ў Будапешце ў Цэнтральна-Эўрапейскім Універсітэце. Установа заснавана ў 1991 г. па фундацыі славутага філантропа Джорджа Сораса ня менш вядомым Карлам Поперам (на жаль, гэтага чалавека ўжо няма ў жывых), эўрапейскім філосафам, адным з аўтараў тэорыі адкрытага грамадзтва. Ва ўніверсітэце пераважае гуманітарны накірунак, ён мае каля 10 факультэтаў, на якія штогод набіраецца 400-450 навучэнцаў. Сярод апошніх - усе з вышэйшай адукацыяй сваіх краінаў, узрост не абмежаваны, трапляюцца людзі ўжо з імёнамі. Першапачаткова ўстанова задумвалася як інстытут для навучаньня ўсходнеэўрапейцаў. Спакваля, прэстыж яе узрастае, так што цяпер у ЦЭУ паступаюць персьпектыўныя вучоныя з усяго сьвету, а лекцыі прыязджаюць чытаць выкладчыкі з Гарварду, Кембрыджу, Оксфарду.

- Здабыцьцё ступені "Master of Arts" (магістра мастацтваў) далося цяжка?

- У адпаведнасьці з сваімі інтарэсамі я абраў факультэт сярэднявечных дасьледваньняў (усяго на ім было 30 чалавек). Мая магістарская праца прысьвечана дыпламатычнаму цырыманіялу позьняга сярэднявечча. Пісалася яна найперш на падставе гісторыі ВКЛ. Першыя часы было цяжкавата - вельмі інтэнсіўная сістэма навучаньня, адрознасьць ангельскай мовы ад той, што карыстаюцца ў нас, пэўны псіхалагічны дыскамфорт. Пасьля ўсё ўсталявалася, нават думаць стаў па-ангельску.

- Як разьвіваецца зараз гістарычная навука на Захадзе?

- Для яе характэрны міждысцыплінарны, сумежны падыход, навізна акрэсьленьня праблемаў, якая можа нават шакаваць . І, канешне, адыход ад пазітывізму. Нашыя ж гісторыкі ідуць звыклым шляхам зьбіраньня, накапленьня фактаў, становяцца часьцяком іх закладнікамі. У гістарычнай навуцы на Захадзе няма зараз школы, якая прэвалюе. Адсутнасьць такога піітэту падаецца станоўчым зрухам.

- Атмасьфера міжнацыянальных стасункаў ва універсітэце?

- Спачатку існавала пэўная напруга - усё ж дзесяткі розных народаў. А пасьля бар'еры зьніклі, утварыліся нават некалькі закаханых параў з прадстаўнікоў краінаў, што варагуюць. Шматлікія вечарыны, экскурсіі па іншых гарадах значна паспрыялі збліжэньню. Але назіралася пэўнае гуртаваньне па прыкмеце рэгіянальнага зямляцтва, асабліва сярод балканцаў. А яшчэ хачу сказаць пра мадзьяраў. Насуперак стэрэатыпу, гэта вельмі добразычлівыя, жыцьцярадасныя людзі. І ўжо бяз комплексу 56-га году.

- Як успрымаюць там Беларусь?

- Пасьля вясеньніх падзеяў цікавасьць да нашай краіны ўзрасла, але зьвесткі даводзіцца здабываць з замежных мас-медыя, бо ў патоку друкаванай інфармацыі беларускія выданьні зусім адсутнічаюць. Беларусь ведаюць перш за ўсё дзякуючы спарцмэнам. (Напрыклад, каталонцы, пры знаёмстве, адразу згадалі нашых гандбалістаў-легіянераў.) Эўрапейцаў больш хвалююць падзеі на Балканах, праблемаў жа такіх краінаў, як Беларусь ці Чачня, яны да канца пакуль не ўсьведамляюць.

- Твой настрой па вяртаньні?

- Вярнуўшыся ў Менск, я адчуў выразны кантраст: змрочны горад, дзе людзі амаль не ўсьміхаюцца. У Горадні я пачуваюся лепш - тут багата маіх сяброў і проста прыязных людзей. Хачу цяпер абараняць дысертацыю на радзіме. Пасьля будзе бачна - маю на сёньняшні дзень шэраг цікавых прапановаў.

Гутарыў Ладзік МАЙНІЧ.

ПАЛАЦ КУЛЬТУРЫ ХІМІКАЎ

запрашае
ў гурткі, студыі і на курсы

ДАРОСЛЫХ: у студыю выяўленчага мастацтва, на шэйпінг і аэробіку, курсы ангельскай мовы, курсы нямецкай мовы, курсы польскай мовы, курсы літоўскай мовы, курсы раскрою і пашыву адзеньня, курсы цырульнікаў і макіяжу, курсы лекавага масажу, курсы сакратарак-машыністак, курсы вязаньня кручком і на прутках, гурткі вялікага тэнісу.

ДЗЯЦЕЙ: у студыю бальнага танца, студыю сучаснага танца, студыю выяўленчага мастацтва, гурток ангельскай мовы, харэаграфічную студыю, гімнастыку і рытміку, падрыхтоўчую групу ансамбля "Крынічка", групы "УШУ" і "Каратэ-до", музычную студыю па класах: фартэпіяна, акардэон, гітара, баян, гурткі футболу, вялікага тэнісу, гурткі футболу.

Запіс праводзіцца штодзённа ў Палацы культуры хімікаў з 8.00 да 20.00 гадзін.

Тэл.: 2-30-07; 2-34-01; 2-55-21; 2-31-76.

БЕЛОРУССКИЙ ФОНД СОРОСА

объявляет конкурсы проектов

в рамках

БИБЛИОТЕЧНОЙ ПРОГРАММЫ

Конкурс "ЗАЩИТА И СОХРАННОСТЬ БИБЛИОТЕЧНЫХ ФОНДОВ"

Могут участвовать как индивидуальные заявки, так и проекты библиотек и других организаций, заинтересованных в решении этой проблемы.

В рамках конкурса не финансируются: научные работы; издание рукописей и монографий; проекты, содержащие теоретические исследования в области консервации и сохранности фондов.

Срок реализации проектов, участвующих в этом конкурсе, - не менее 1 года.

Конкурс "ДОКОМПЛЕКТОВАНИЕ ФОНДОВ БИБЛИОТЕК РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ"

Могут принимать участие **ТОЛЬКО БИБЛИОТЕКИ** (независимо от их ведомственной принадлежности). Предпочтение будет отдаваться заявкам на приобретение информационных, справочных, научных и учебных изданий, в том числе периодических - не более двух экземпляров каждого издания. Язык, тип, вид и форма издания значения не имеют.

Срок реализации проектов, участвующих в этом конкурсе, - не более 6 месяцев.

Проекты на конкурсы подаются в виде заявок на грант.

Форму заявки и разъяснения по ее заполнению можно получить в Белорусском Фонде Сороса или в его областных отделениях:

220027 г. Минск, пр.Ф.Скорины, 65, корпус 11А БГПА, комн.107, Белорусский Фонд Сороса

210026 г. Витебск, ул. Замковая, 4, комн. 215, Витебское отделение БФС

246652 г. Гомель, ул. Кирова, 32-а, Гомельское отделение БФС.

Заявки на конкурсы высылаются *В ТРЕХ ЭКЗЕМПЛЯРАХ* по указанному выше адресу Белорусского Фонда Сороса – с пометкой названия конкурса на конверте.

Заявки, поданные не по форме, не рассматриваются.

Последний срок подачи заявок - **20 сентября 1996 года.**

С вопросами обращайтесь по телефонам: (017) 232-80-92, 232-77-13, 232-70-64

©Гомфактрим 061

КРЫЖАВАНКА

Перакладзі на беларускую мову

Склаў Іван КУРБЕКА.



Па гарызанталі: 7. Сохранение. ~~8.~~ Хищник. ~~9.~~ Делёж. ~~10.~~ Свидетель. 11. Уйма. ~~14.~~ Почка (анат.) 16. Затылок. 18. Чибис. 20. Трюкачество. 23. Бедняга. 25. Клочья. 26. Слюна. 29. Белена. 30. Холст (тонкий). 31. Ломовой извозчик. 32. Страдалица. 33. Значительность.

Па вертыкалі: 1. Закоулок. ~~2.~~ Ссора. ~~3.~~ Княжна. ~~4.~~ Прибыль. ~~5.~~ Насест. ~~6.~~ Лихорадка. ~~12.~~ Частник. 13. Издержка. 15. Достояние. 17. Струя. 19. Невежда. 21. Полугодовалый телёнок, ягнёнок. 22. Скромность. 24. Оседлость. 25. Шинковка. 27. Уединение. 28. Игра.

Адказы на крыжаванку, зьмешчаную ў папярэднім нумары:

Па гарызанталі: 5. Сырадой. 6. Рухавік. 10. Звадыяш. 11. Вупраж. 12. Скочка. 16. Крыжадзюб. 18. Загад. 19. Цацка. 20. Кіданне. 21. Сакавік. 25. Воўна. 26. Поўня. 27. Сцісласць. 30. Гарляк. 33. Няўрод. 34. Буралом. 35. Вяргіня. 36. Падруба.

Па вертыкалі: 1. Грукат. 2. Позва. 3. Муляр. 4. Авечка. 7.Штурхач. 8. Адзнака. 9. Сукенка. 13. Зручнасць. 14. Людскасць. 15. Галізна. 17. Палітон. 22. Постаць. 23. Гультай. 24. Знямога. 28. Вячэра. 29. Пястун. 31. Кузня. 32. Сорам.

РАТУНАК АПОШНЯГА СЯЛЯНСКАГА ПАЭТА

Памерла жонка паэта Міхася Васілька Марыя Іванаўна Касьцевіч. Часьцей мы ўзгадваем творцаў, якія ўзбагацілі нашу нацыянальную традыцыю і забываем пра тых, хто быў побач з імі ў звыклым штодзённым жыцьці...

Першая жонка Міхася Васілька - Галя - паходзіла з той жа вёскі Баброўня, каля Скідаля, што і паэт. Іх сын Леанід памёр у гэтым годзе ў Зэльве, дзе ён працаваў у раённай газеце, а яго маці памерла ад туберкулёзу яшчэ да вайны.

Марыя Іванаўна нарадзілася ў вёсцы Чамяры каля Слоніма.

У часы вайны разам з трымя дачкамі яна апынулася на хутары каля Скідаля, а Міхась Васілёк - тады падпольшчык-антыфашыст - стаў завітваць да яе ня столькі як да сувязной, колькі як да чалавека, побач з якім адагравалася яго душа.

У 1946 годзе паэт прыехаў у Горадню і стаў працаваць у "Гродненской правде". Тады ж ён ажаніўся з Марыяй Іванаўнай і нарадзілася сям'я, у якой да чатырох дзяцей далучыўся і пяты - Яраслаў, Ярык, як клікалі яго бацькі.

Марыя Іванаўна была сапраўдным сябрам для Міхася Восіпавіча. Яна ня толькі займалася гаспадаркай, выхоўвала дзяцей, але была і першай, каму паэт чытаў свае вершы, да парадаў якой прыслухоўваўся, высока цэнячы яе чамярынскае моўнае пачуцьцё.

Пра Міхася Васілька і ягоную творчасьць, пра сям'ю і спадчыну апавядае яго вучаніца, паэтка, дырэктар Літаратурнага музея Гарадзеншчыны, спадарыня **Данута Бічэль-Загнетава:**

- Сям'я М.Васілька была надзвычай



гарманічная, яна была ратункам для паэта, якога, як беларускую вёску і нашага селяніна, зруйнавалі калгасы. Гэта была асабістая трагедыя творцы, які быў сялянскім паэтам.

Міхась Восіпавіч спрабаваў зразумець новае жыцьцё і пісаць песьні калгаснага ладу, якія былі дасканалымі па форме, але халоднымі, пазбаўленымі духоўнай сьветласьці. Таму і засталося ў беларускай літаратуры тое, што было напісана да вайны: зборнік "Шум баравы" (1929) і "З сялянскіх ніў" (1937).

Засталіся і асабістыя рэчы паэта, партрэт, намаляваны да юбілея Данілам Парахнём. Але, на жаль, згубілася шмат рукапісаў, што захоўваліся ў Гарадзенскім гісторыка-археалагічным музеі і, нават, аўтограф верша "Дожджык", які паэт прысьвяціў сыну Ярыку і які той падараваў тады яшчэ літаратурнаму аддзелу гістарычнага музея. Дзякуй Богу, тое-сёе захавалася і будзе экспанавацца ў Літаратурным музеі, які месьціцца ў Доме М.Багдановіча.

Памёр Мікась Васілёк у верасьні 1960 году. Я добра памятаю дзень пахаваньня. І вось адыйшла яго жонка Марыя Іванаўна - далікатны, разумны, добрай душы чалавек, каля якой хаваў сваю скалечаную душу апошні сялянскі паэт Беларусі.

...Марыю Іванаўну пахавалі на старых праваслаўных могілках у Горадні побач з мужам. Даруй, Божа, пакой яе душы.

Т.КАВЕЦКАЯ.

НА ЗДЫМКУ: М.Васілёк, Марыя Іванаўна і малодшыя дзеці.

НАШ КАЛЯНДАР

23 жніўня

1895 г. Памёр Міхал Андрыёлі, знакаміты мастак, удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху.



24 жніўня

1744 г. У Горадні адбыўся павятовы соймік: паслам на сойм было даручана адстойваць права "ліберум вета".

25 жніўня

1932 г. У вёсцы Крушыняны (цяпер на Беласточчыне) нарадзіўся Пятрусь Макаль, вядомы пісьменнік. Вучыўся і працаваў у Горадні.

26 жніўня

1861 г. У Горадні адбылася буйная рэлігійна-палітычная маніфестацыя супраць уладаў.

1880 г. Нарадзіўся Гіём Апалінэр, знакаміты французкі паэт, які паходзіў з роду беларусаў Кастравіцкіх.

27 жніўня

1936 г. У вёсцы Агароднікі (Ашмянскі раён) нарадзіўся Мар'ян Нікадон, вядомы пісьменнік.

28 жніўня

1961 г. У Горадні нарадзіўся Аляксандр Курловіч, славуты штангіст, чэмпіён Алімпійскіх гульняў у Сеуле і Барселоне.

29 жніўня

1756 г. нарадзіўся (240 гадоў таму) Ян Сьнядэцкі, знакаміты астраном, матэматык, рэктар Віленскага універсітэту.

30 жніўня

1885 г. У Навагрудку памёр Юльян Корсак, паэт-рамантык, перакладчык, ураджэнец Слоніма.

Падрыхтаваў Ул.ХІЛЬМАНОВІЧ.

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013



СРЭБРА ПЛЮС БРОНЗА

Першыя медалі на спаборніцтвах X Параалімпійскіх гульняў у Атланьце для Беларусі заваявалі гарадзенцы. Мікалай Дзянісевіч заняў 2-е месца ў штурханьні ядра ў катэгорыі для людзей з слабым зрокам. Чэмпіёнка Эўропы 1995 году Ядвіга Скарабагатая выйграла бронзу ў кіданьні кап'я.

В.Д.

ЦІ ХОПІЦЬ ДУХУ?

"Дзяжурныя" нулі прывезьлі з чарговых выязных гульняў чэмпіянату краіны па футболе "Нёман" і "Абутнік". Гарадзенцы бясслаўна "ляглі" пад наваполацкі "Нафтан-Дэвон" - 0:4, а лідчукі саступілі "Атацы-Аўры" - 1:2. У турнірнай табліцы "Нёман" і "Абутнік" займаюць адпаведна 11-е і 14-е месцы.

У спаборніцтве камандаў II лігі на першае месца за 8 гульняў да канца чэмпіянату выйшаў слонімскі "Камунальнік", які ў апошнім туры перамог у Воршы "Максім-Легмаш" 4:0. Каманда, якая перад пачаткам і па ходзе сезону згубіла такіх моцных гульцоў, як Дзьмітры Балашоў, Тэймаз Гумераў (перайшлі ў менскае "Тарпеда"), брамнік Валянцін Бурнос (гуляе зараз за "Абутнік"), Мікалай Дым (цяжкая траўма), рэальна прэтэндуе на выхад у першую лігу. Праўда, такая ж карціна была і ў папярэдніх чэмпіянатах, аднак на рашаючы крок не хапала духу. Магчыма, пашанцуе гэтым разам.

***

Кубак УЕФА. Адказныя гульні.

"Бешыкташ" (Турцыя) – "Дынама" (Менск) – 2:0. (Лік першай сустрэчы 1:2).

"Дынама-93" (Менск) – "Хельсінгборг" (Швэцыя) – 0:3. (1:1).

Кубак кубкаў.

"Рэйк'явік" (Ісландыя) – МВКЦ (Мазыр) – 1-0 (2-2).

Усе беларускія клубы выбылі з эўракубкаў.

Вітаўт РУДНІК.

КІНААФІША ГОРАДНІ

"КАСТРЫЧНІК": 23,24, 25 і 26 жніўня - "Сьмяротная бітва" -10.00 (ільготны), 13.30, 15.00. "Кожная дзяўчына мае свой шанц" - 15.20, 17.10 і 18.50. "Нулявы допуск" -15.30 і 17.20. ВІДЭА: "Учарашняя мішэнь" (баявік) - 15.00. "На старт - пайшоў!" (камедыя) - 16.50, 18.40. "Яма"(эротыка) - 20.30.

Кіно - дзецям: 25 жніўня - "Аліся ў краіне цудаў" - 12.00. "Сямейка Фінстоўн" (другі фільм) - 12.30, 13.30. 27 жніўня - "Карабель прышэльцаў" - 11.00. 29 жніўня - "Скарб рыцара Мілоты" - 11.00.

Школьная дыскатэка - кожныя сераду і нядзелю. Пачатак -19.00.

"ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА": 23 жніўня -"Кікбаксёр-3" - 11.20 (ільготны). 24, 25 і 26 жніўня -"Сем"(трылер) - 12.10, 16.30 і 20.50. "Невыканальная місія" (баявік) - 14.20 і 18.40. "Занадта быстры, занадта малады" -13.50. "Спакушаная Анжэла" (эротыка) - 16.00, 18.00 і 20.00.

"КОСМАС": 23 жніўня - "Ракавы лік" - 13.40, 17.20 і 21.00 (падоўжаны). 24 жніўня - "Ракавы лік" - 13.40, 18.30 і 20.00. "Заціснутыя і прыціснутыя" - 15.20 і 17.00.

Дыскатэка - 21.30.

25 жніўня - "Кашмары на вуліцы Вязаў" -10.00. "Ракавы лік" -11.50, 13.40, 18.30 і 20.00. "Заціснутыя і прыціснутыя" - 15.20 і 17.00.

Дыскатэка -21.30.

"Ім. ПУШКІНА": 23 жніўня - "Зубасьцікі-3" - 10.00. "Дзень Незалежнасьці" - 11.40. "Мацнейшы ўдар" (ч.2) - 14.10, 15.50, 17.30 і 19.10.

Дыскатэка - 21.00.

24 жніўня - "Зубасьцікі-4" -10.00. "Уласнымі намаганьнямі" (ч.2) -14.10, 18.20 і 20.00.

Дыскатэка - 21.00.

УСЕ "КРЫНІЦЫ" ЦЯКУЦЬ У "НЁМАН"

"Нёман" - "Юнацтва" - 7:4
"Палімір" - "Юнацтва" - 8:5
"Нёман" - "Палімір" - 5:1

Традыцыйны перадсезонны турнір на Кубак Беларускай федэрацыі хакея звыкла ўдала складваецца для гарадзенцаў. Менавіта яны былі ўладальнікамі ўсіх папярэдніх трафеяў "Крыніцы". Першы этап чарговага розыгрышу прайшоў днямі ў Горадні. Нават у адсутнасьці галоўнага трэнера Анатоля Варывончыка (ён рыхтуе зборную краіны да кваліфікацыйнага алімпійскага турніру ў Рызе), нёманцы пацьвердзілі сваё фаварыцтва.

Цэнтральнай дзеяй трохдзённых "скрыжаваньняў" клюшак стаўся матч у аўторак, калі сышліся чэмпіён УЭХЛ і чэмпіён краіны. Найбольшай упартасьцю вызначаўся першы перыяд. На 4-й хвіліне Дзьмітры Мядзьведзеў зьдзейсьніў слаламны рэйд і дакладна "выкінуў" шайбу на Алега Малашкевіча - 1:0 (гаспадары гулялі ў большасьці). У далейшым паліміраўцы стварылі шэраг вострых момантаў, але самаахвярна "адбіваўся" ў брамцы Емельянаў. Праўда, на 10-й хвіліне і ён ня здолеў ўратаваць каманду, калі абаронцы авантурна пакінулі аднаго Анатоля Валадкевіча. Гулец нацыянальнай "маладзёўкі" (які нядаўна спрабаваў уцячы ў ЗША) параўняў лік. Пераломным стаў другі перыяд, калі на шайбы Кадырава і Пуціленкі госьці не змаглі адказаць нічым. А на 4-й хвіліне заключнага перыяду Аляксандр Чурубаеў, рэалізаваўшы колькасную перавагу, канчаткова зьняў усе пытаньні.

У атацы Дзьмітры Мядзьведзеў.

Другі этап Кубку "Крыніцы" пройдзе ў Наваполацку. Магчымы ўдзел (па-за конкурсам) менскага "Цівалі" і маладзёжнай дружыны Польшчы.

Хельмут КАМЕНСКІ.
Фота Я.ВАНЮКЕВІЧА.

СТРЫЖАНЬ ЭЛІТАРНАЙ АДУКАЦЫІ

Сёлета ў Горадні адбыўся першы выпуск Беларускага гуманітарнага ліцэя. Слабенькі расточак беларускай элітнай адукацыі ў нашым горадзе мацнеў, падпітваючыся нешматлікімі энтузіястамі. З двух перадліцэйных класаў вырас у чатыры, выгадаваўшы ўласна ліцэйныя класы. І нарэшце, у мінулым годзе атрымаў статус Беларускага гуманітарнага ліцэя. І вось надыйшоў час падводзіць першыя вынікі.

З 15 выпускнікоў ліцэя пяцёра атрымалі срэбныя медалі. Дый у астатніх у атэстаце большасьць пяцёрак.

Разам з атэстатам выпускнікі атрымалі і сьпецыяльны ўкладыш, на які дало згоду Міністэрства адукацыі, каб падкрэсьліць элітарны характар вучобы ў ліцэі. Ва ўкладышы пазначаны ўсе сьпецкурсы, якія ліцэісты засвоілі пад час вучобы: гісторыя і культура беларускай мовы, мастацкая культура Беларусі ў кантэксьце сусьветнай, традыцыйная народная культура, гісторыя і культура Гарадзеншчыны, філасофія.

Трое выпускнікоў яшчэ ў дзень здачы апошняга выпускнога іспыту, па выніках сумешчаных выпускных і ўступных экзаменаў у Гарадзенскі універсітэт, былі залічаны ў гэтую ВНУ на сьпецыяльнасьці: беларуская мова і літаратура, славянскія мовы і літаратуры. Дзевяць - сталі студэнтамі розных інстытутаў і універсітэтаў Горадні, Менска, Магілёва з даволі шырокім сьпектрам адукацыі: беларуская філалогія, нямецкая мова, культуралогія, эканоміка, фінансы, правазнаўства, аграномія. Адна з выпускніц ліцэя яшчэ напрыканцы навучальнага году пасьпяхова прайшла іспыты ў адзін з універсітэтаў Польшчы (канкрэтнае разьмеркаваньне адбудзецца трохі пазьней).

У выніку, 13 ліцэістаў сёлета сталі студэнтамі разнастайных ВНУ. Безумоўна, гэта заслуга і гуманітарнай адукацыі.

А што чакае беларускі гуманітарны ў будучым?

СШ N 27, на базе якой апошні навучальны год працаваў Беларускі гуманітарны ліцэй, рашэньнем гарвыканкаму расфарміроўваецца. З 1 верасьня бягучага году ў яе будынку адчыняецца шматпрофільны гарадзкі ліцэй.

Беларускі гуманітарны стане састаўной часткай новай навучальнай установы. Улічваючы трохгадовы досьвед, можна меркаваць, што гэта будзе стрыжань, на якім павінна трымацца элітарная нацыянальная сярэдняя адукацыя ў Горадні.

Алесь ГОСЬЦЕЎ, метадыст ліцэя, член Саюзу журналістаў Беларусі.

ШЛЯХАМ ВОЙШАЛКА

Сьвята беларускага пісьменства і друку сёлета праводзіцца першага верасьня на Наваградчыне.

Урачыстае яго адкрыцьцё намечана першага верасьня на плошчы імя Леніна. На пачатку яго адбудзецца гістарычна-мастацкае шэсьце ад гары Міндоўга. З боку Мікольскай царквы будзе рухацца хрэсны ход з лампадай з агнём ад Магілы Гасподняй. Сцэнарый мяркуе ў час шэсьця і хрэснага ходу ўваскрэсіць фрагменты гістарычнага мінулага Беларусі. Перад ўдзельнікамі сьвята пройдуць сцэнізаваныя вобразы Ефрасіньні Полацкай, Францыска Скарыны.

Сьвяты агонь ад магілы Гасподняй панясуць з Наваградка ў Лаўрышава.

У гэтым мястэчку калісьці князь Войшалк заснаваў кляштар. Раённыя ўлады зараз разглядаюць пытаньне аб пабудове ў Лаўрышаве капліцы ці помніка.

Вацлаў СЯРПІНСКІ.

МАСТАЦКІ ТЭЛЕГРАФ

* * *

15-18 жніўня ў Вільні прайшоў гучны фэст вулічных тэатраў, арганізаваны культурніцкімі структурамі Летувы і Францыі. На тэатральным сьвяце прэзентавалі свае артыстычныя здольнасьці калектывы з 25 краінаў сьвету.

Беларусь на фэсьце ганарова прадстаўлялі гарадзенцы Віктория і Аляксандр Цібяньковы (мадэрн-балет "Галерэя"), група фальклорнага авангарду "Авось" у складзе Элы Окалавай, Пятра Рака і Ларысы Пархамчук, а таксама Марына Пілічава ды Ірына Сільвановіч з галерэі "У майстра". Падарожжа гарадзенцаў у Вільню фінансавала база "Бакалея".

* * *

17-18 жніўня ў вёсцы Бачэйкава Бешанковіцкага раёну Віцебскай вобласьці праходзіла Рэспубліканскае сьвята "Ганчарны круг-96".

У віцебскую вёсачку зьехаліся ганчары і народныя майстры-керамісты з усёй Беларусі, каб сябе паказаць ды на іншых паглядзець, папрацаваць непасрэдна на ганчарным коле, паўдзельнічаць у конкурсе ды круглым стале па праблемах аднаўленьня і разьвіцьця аўтэнтычнай традыцыі ганчарства ў краіне.

Пасьпяхова прэзентаваліся на сьвяце і народныя майстры з Гарадзеншчыны Таццяна Шубіна, Анатоль Рагалевіч, Аліна Бернатовіч, Мікалай Скляр і Алег Ігліцкі.

Ёсьць спадзеў, што прыклад сьвята "Ганчарны круг-96", выдатна арганізаванага Міністэрствам культуры Беларусі, паспрыяе аднаўленьню традыцыі ганчарных промыслаў на Беларусі ды прыцягне моладзь да заняткаў ганчарным рамяством.

Ігар ГАНДЛЕЎСКІ.

НАШЫ ДЗЕЦІ

У Менску выйшаў першы нумар каляровага часопіса "Наши дети". Усю вокладку займае надзвычай артыстычны фотаздымак юнай музыканткі з Ліды Дзінары Мазітавай. Дзінары ўсяго 12 гадоў, але яна ўжо аўтар звыш сотні музычных твораў, сярод якіх музыка да оперы і балету.

Яраслаў ГРЫНЬКЕВІЧ.

ГАРАСКОП НА ТЫДЗЕНЬ

БАРАН (21.3 - 20.4) У працы мяркуюцца посьпехі. Аднак, ня траць галавы. Добрую атмасьферу скарыстай у перамовах з шэфам. Дый у сераду ж не забудзься на падарунак ці кветку для любае асобы.

БЫК (21.4 - 20.5) Бліжэйшымі днямі можаш атрымаць вабную рабочую прапанову. Але не сьпяшайся з надумам, бо сьпех не найлепшы дарадца. Парайся з Шалямі. У суботу меціме ш флірт з Казярогам ці Вадалеем.

БЛІЗЬНЯТЫ (21.5 - 21.6) Збытаны тыдзень, рабочых спраў будзе звыш чаканьня. Суцешся думкаю, што не такія ўжо яны вялікія. Значная грашовая ўспамога скрасіць жыцьцё.

РАК (22.6 - 22.7) У працы старайся дакончыць распачатыя справы. Потым займайся парадкаваньнем жытла. У выходныя дні могуць наведацца госьці. Зважай, што нехта з іх схоча затрымацца ў Цябе на даўжэй.

ЛЕЎ (23.7 - 23.8) Вылучна ўдалы тыдзень што да сябраваньня. Нехта з-пад знаку Вадалея прапануе Табе вабнае спатканьне. Але не пачынайце з банкету, яшчэ будзе на тое час.

ДЗЕВА (24.8 - 23.9) Адразу, як Сонца стане ў Твой знак, зьявіцца багата спрыяльных выпадкаў. Чакае надзвычай карысная дамова, але зважай, спаборнікі ня сьпяць. У сераду - мілае спатканьне з кімсьці з-пад знаку Быка.

ШАЛІ (24.9 - 23.10) Меркурый ў Тваім знаку (26.08), заахвоціць да падарожжа. Побыт на сьвежым паветры і рух паспрыяюць Табе. У працы прапануеш творчыя ідэі. Можаш разьлічваць на дапамогу Стральца.

СКАРПІЁН (24.10 - 22.11) Апынешся ў становішчы таго восьліка, якому ў жалабок усё пакладзена... Бо і ў працы можаш зазьзяць, і зоры зычаць каханьне. Канец тыдня прысьвяці асабістым справам.

СТРАЛЕЦ (23.11 - 21.12) Думак Табе ніколі не бракуе, цяжэй іх ажыцьцяўляць. Трэба будзе набрацца цярплівасьці ў дзейнасьці. На ўзнагароду меціме ш аванс ці іншую рэч. Твой "добры дух" - Шалі.

КАЗЯРОГ (22.12 - 20.1) Надзвычай няўпэўнены для Казярогаў тыдзень. На сваім шляху сустрэнеш некага, хто дадасьць упэўненасьці. Калі той будзе з-пад знаку Быка - для Цябе гэта "стрэл у дзесятку".

ВАДАЛЕЙ (21.1 - 19.2) Цябе чакаюць крыху цяжэйшыя дні. Прысьвяці болей часу хатнім справам. Спакой і трываласьць духу зьяўляюцца найлепшымі лекамі ад усякіх болесьцяў. Ня траць надзей на лепшае.

РЫБЫ (20.2 - 20.3) Бліжэйшымі днямі Венера вяшчуе моцнае ўзрушэньне. І Поўня дадасьць Табе сілаў (28.08) Самотныя асобы змогуць знайсьці сваю "другую палову". У суботу вельмі ўдалая сустрэча з Казярогам ці Баранам.

К Р Ы М І Н А Л

КАЛІ НЯМА ІНШАГА ВЫЙСЬЦЯ...

У бальніцу хуткай дапамогі з небясьпечнымі траўмамі была дастаўлена маладая жыхарка Гарадзенскага раёну. Пацярпелая паведаміла медперсаналу, што саскочыла з 4-га паверха дома па вуліцы Дамброўскага пасьля таго, як яе, пагражучы нажом, згвалтавалі двое маладых хлопцаў.

СВАІХ ЖА...

Дзьве студэнткі дзяржуніверсітэту пацярпелі ад ліхадзеяў на вуліцы Пушкіна. Трое рабаўнікоў у масках вырвалі з дзявочых рук сумачкі з небагатымі студэнцкімі грашыма, а ў дадатак з шыі адной з ахвяр сарвалі залаты ланцужок.

Як і ў папярэднім выпадку, злачынцы былі затрыманы. Цікава, што да кампаніі вулічных "гопстопнікаў" далучыўся і студэнт сельгасінстытуту - зьява раней вельмі рэдкая.

ЗНАЙШОЎ...

А вось вайсковец з Горадні, які таксама апынуўся ў бальніцы хуткай дапамогі з пераломам рукі і траўматычнымі пашкоджаньнямі пальцаў, трапіў на хірургічны стол прама з рыбалкі, якою займаўся на Сьвіслачы каля вёскі Сухая Даліна. Як патлумачыў капітан, у яго руках узарвалася выбуховая прылада, знойдзеная ім на беразе.

Іван ДАНІЛОВІЧ.

ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

ПАГОНЯ

Заснавальнік: культурна-асьветніцкі фонд «Бацькаўшчына»
Рэгістрацыйны нумар 597
Падпісны індэкс 63124

Адрас рэдакцыі:
230023, г.Горадня, вул. Дамініканская,1
☎ (0152) 72-35-61, 72-29-96
E-mail: andrei@pagonia.belpak.grodno.by
FREESPACE BBS 0152-72-37-14 (23.00-10.00)

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасьць за падбор і дакладнасьць фактаў, іх меркаваньні не абавязкова адлюстроўваюць погляд рэдакцыі.
Адказнасьць за зьмест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Гарадзенская абласная ўзбуйнёная друкарня:
230023, г.Горадня, вул. Паліграфістаў, 4
Заказ 2855. Наклад 13219
Нумар падпісаны да друку ў 16.00, 22.08.96

Рэдактар Мікола Маркевіч

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013